РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЖНІЎНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 150 (30538)

# ЦІШЭЙ ЕДЗЕШ — ДАЛЕЙ БУДЗЕШ!

## З якімі зменамі ў ПДР давядзецца змірыцца самакатчыкам і не толькі?

Надзённую і неадназначную тэму сродкаў персанальнай мабільнасці (СПМ) «Звязда» ўжо ўздымала неаднойчы. З аднаго боку — даступнасць і камфорт, з другога — ДТЗ і чалавечыя жыцці. І як толькі не спрабавалі ўтаймаваць электрасамакатчыкаў, але жудасная статыстыка, якая ў нармальнага чалавека павінна адбіваць любоў да такой хуткасці, усё працягвала расці... Лётаючы на электрасамакатах дзе заўгодна, людзі рызыкавалі не толькі сваім жыццём, але і іншых. Менавіта для таго, каб перадухіліць новыя трагедыі, 5 жніўня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 295, якім карэкціруюцца Правілы дарожнага руху. Пра новыя нормы, змяненні і дапаўненні, а таксама пра тое, ці атрымаецца ўсё ж такі ўтаймаваць аматараў такога экалагічна чыстага транспарту — з першых вуснаў ад ініцыятараў змяненняў у ПДР. СТАР. 5



Фота БелТА.

ЧАМУ ВАРТА ПАБЫВАЦЬ У ПІНСКУ

14



АБІТУРЫЕНТ-2025

## МАТЫВАВАНЫЯ НА ВУЧОБУ І РАЗВІЦЦЁ

### Беларускія ВНУ падводзяць вынікі прыёмнай кампаніі, а ва ўстановах сярэдняга спецыяльнага і прафесійна-тэхнічнага навучання яна працягваецца



«Сёлета вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны папоўняцца 48 тысячамі таленавітых студэнтаў. Гэта не проста лічба, а асобы заўтрашняга дня: будучыя вучоныя, урачы, IT-інаватары, эканамісты і творцы культуры», — так вобразна падводзіць вынікі прыёмнай кампаніі ў ВНУ прэс-служба Міністэрства адукацыі. СТАР. 7

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25150>

9 771990 763008

# «ІНВЕСТЫЦЫІ Ў НАВУКУ СЁННЯ — Ў ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

## Эксперты — аб выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы

Настаў час усвядоміць, што навука важная і без яе немагчыма прасоўванне наперад. Гэта пытанне нацыянальнай бяспекі. Але сёння трэба вызначыць, у якім кірунку павінна развівацца айчынная навука, аддаць перавагу фундаментальным даследаванням або зрабіць прыярытэтнай прыкладную навуку, дзе можна без вялікай рызыкі досыць хутка атрымаць пэўныя карысныя вынікі. Пра гэта напярэдадні ішла размова на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, якая датычылася ўдасканалення работы Нацыянальнай акадэміі навук. У цэнтры ўвагі — практыкаарыентаванасць навуковых даследаванняў, распрацоўка выразных і ўсім зразумелых крытэрыяў эфектыўнасці атрыманых вынікаў і, мабыць, самае важнае — выяўленне магчымасцяў атрымання эканамічнай карысці ад удасканалення тэхналагічных і іншых працэсаў на аснове навуковых дасягненняў. Нашы эксперты — аб важных пасылах Прэзідэнта па далейшым развіцці навуковага асяроддзя.

### САМО ЖЫЦЦЁ ПАТРАБУЕ «ПРЫЗЯМЛЕННЯ» НАВУКОВЫХ ПОШУКАЎ

Менавіта для таго, каб спакойна разабрацца ў сітуацыі, зразумець прычыны і вынікі, прапанаваць навукова абгрунтаваныя меры інтэнсіфікацыі навуковых даследаванняў па патрэбных для краіны кірунках, Прэзідэнт Беларусі чарговы раз сабраў нараду з рабочай групай па аналізе дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — галаўной арганізацыі, якая вызначае вектары развіцця айчыннай навуковай думкі. Для абмеркавання вострых пытанняў былі запрошаны ўсе, хто ў рознай ступені датычны да дзейнасці навуковай супольнасці.

Што ж турбуе кіраўніка дзяржавы і як ён ацэньвае сітуацыю, што склалася, якія задачы ставіць перад навукоўцамі?



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА** акцэнтуе ўвагу вось на чым:

**— Прэзідэнт уважліва прааналізаваў падрыхтаваныя рабочай групай матэрыялы і адзначыў, што «на фінансаванне навуковых даследаванняў трацішча шмат дзяржаўных сродкаў, а належнай аддачы мы не бачым. Ёсць толькі кропкавыя станоўчыя вынікі без шырокага ўкаранення ў галіны эканомікі. Сёння гэтага відавочна недастаткова», — нагадаў суразмоўца.**

Ён падкрэсліў, што заўвага справядлівая і больш чым своечасовая:

— Беларусь атрымала ў спадчыну ад Савецкага Саюза магутны навуковы патэнцыял, прадстаўлены акадэмічнымі, універсітэцкімі і галіновымі арганізацыямі. У навуковай галіне працуюць тысячы навукоўцаў, якія ствараюць прадукцыю, прызнаную ва ўсім свеце. Дзяржава шчодра фінансуе правядзенне навуковых распрацовак, маральна і матэрыяльна падтрымлівае вядучых прадстаўнікоў навуковай супольнасці, якімі атрыманы вынікі, значныя для эканамічнай і сацыяльнай сферы.

Разам з тым, звяртае ўвагу суразмоўца, само жыццё патрабуе «прызямлення» навуковых пошукаў і правядзення даследаванняў з улікам асаблівасцяў эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця нашай краіны ва ўмовах знешніх выклікаў і пагроз:

— Напрыклад, мы паступальна асвойваем рынкі краін глабальнага Поўдня, пастаўляем туды якасную прадукцыю, у якой зацікаўленыя спажыўцы. Пра гэта неаднаразова афіцыйна заяўлялі лідары і прадстаўнікі афрыканскіх і азіяцкіх краін, з якімі Беларусь развівае ўзаемавыгадныя гандлёва-эканамічныя адносіны. Аднак варта прызнаць, што сур'ёзную канкурэнцыю нам складаюць карпарацыі з іншых высокаразвітых у навукова-тэхналагічным плане дзяржаў свету, у тым ліку і з дружалюбных. Такім чынам, каб вытрымаць саперніцтва, захаваць і пашырыць рынкі, нам неабходна ў апераджальным тэмпе максімальна выкарыстоўваць навуковы патэнцыял для выпуску прадукцыі новага пакалення, тавараў «заўтрашняга дня», асартымент якіх па цане і якасці на ўра «зойдзе» афра-азіяцкаму (і не толькі) спажыўцу. Іншага шляху цывілізацыйнага развіцця ў нас проста няма.

Таму, робіць выснову парламентарый, на аснове глыбінных дасягненняў фундаментальнай навукі неабходныя і прынцыповыя тэхніка-тэхналагічныя прарывы ў прыкладных даследаваннях з наступнай манетызацыяй атрыманых вынікаў.

— Навука павінна так паўплываць на развіццё ўсіх сфер эканомікі, каб забяспечыць прагрэс усіх яе сістэм. Іншымі словамі, навуковыя высновы, прапановы і рэкамендацыі навукоўцаў павінны падняць краіну на якасна новы ўзровень інтэнсіўнага развіцця ва ўсіх жыццёва важных сферах, — перакананы Алег Дзячэнка.

### ЗАСЯРОДЗІЦЬ НАМАГАННІ НА ТРАДЫЦЫЙНА МОЦНЫХ КІРУНКАХ

На нарадзе з рабочай групай па аналізе дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр Лукашэнка вылучыў тры асноўныя кірункі, на якіх варта засяродзіць увагу ў найбліжэйшай перспектыве. Гэта практыкаарыентаванасць навуковых даследаванняў, укараненне распрацовак у эканоміку і сацыяльную сферу, а таксама імпартазамяшчэнне і экспарт навукова-тэхнічнай прадукцыі, нагадвае **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людміла САПЕГА.**



Суразмоўніца звяртае ўвагу на тое, што гэтыя тры кірункі зводзяцца ў канчатковым выніку да адной мэты — атрымання належнай аддачы ад фінансавання навуковых даследаванняў, на якія штогод трацішча немалыя дзяржаўныя сродкі.

**— Аляксандр Лукашэнка цалкам мае рацыю, патрабуючы ад акадэмічнай, галіновай і ўніверсітэцкай навукі ісці ў нагу з часам і быць настроенымі на той жа вынік, што і краіна ў цэлым. Тым больш што неабходны навуковы і прамысловы патэнцыял у краіне даўно склаўся. А вось цеснае ўзаемадзеянне паміж навукай і вытворчасцю наладжана далёка не ва ўсіх галінах.**

Таму, настойвае кіраўнік дзяржавы, беларускія спецыялісты павінны больш актыўна ўключыцца ў распрацоўку суперперспектыўных кірункаў, ад якіх залежыць не толькі стан айчыннай эканомікі, але і нацыянальная бяспека дзяржавы ў цэлым. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка перасцерагае навукоўцаў ад спроб распыляць сілы і гнацца за дасягненнямі ў іншых краінах. І прапануе засяродзіць намаганні на тых кірунках, у якіх беларуская навука традыцыйна моцная і мае ўласныя навуковыя школы, — адзначае парламентарый.

Сенатар цалкам салідарная з высновай Прэзідэнта, што толькі такі выверання, мэтанакіраваны падыход да навуковых распрацовак дасць магчымасць атрымаць ад іх важкі эканамічны эфект.

— І не ў аддаленай будучыні, а ў найбліжэйшай перспектыве. Што асабліва важна для паспяховага вырашэння задач, заяўленых у рамках абвешчанай у краіне пяцігодкі якасці, — падкрэслівае парламентарый.



Як уплываюць навуковыя распрацоўкі з пункту гледжання практыка, распавёў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ігар СЯРГЕЕЎ.**

Практычная накіраванасць навуковых даследаванняў, іх укараненне ў эканоміку і сацыяльную сферу, імпартазамяшчэнне і экспарт навукова-тэхнічнай прадукцыі — пытанні, якія патрабуюць мадэрнізацыі, перакананы сенатар:



# ГЭТА ІНВЕСТЫЦЫІ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ»

## з рабочай групай па аналізе дзейнасці НАН

— Сёння ўявіць свет без сучасных тэхналогій немагчыма. Навуковыя распрацоўкі глыбока інтэграваліся ў наша жыццё і імкліва развіваюцца. На прыкладзе ААТ «Беларускі цэментны завод», дзе ўпершыню ў сусветнай практыцы быў укаранёны «сухі» спосаб вытворчасці цэменту з высокавільготных мелаў замест традыцыйнага «мокрага» спосабу, улічваюцца і прымяняюцца на практыцы даследаванні навукоўцаў.

Кіраўнік прадпрыемства дадаў, што ў вытворчасці прымяняюцца інавацыйныя і экалагічна бяспечныя тэхналогіі, рацыянальна выкарыстоўваюцца прыродныя рэсурсы. А жорсткі вытворчы кантроль якасці прадукцыі, выкарыстанне сучасных тэхналогій спрыяе выпуску высакаякасных будаўнічых матэрыялаў.

Ігар Сяргееў перакананы: сучасная вытворчасць мае патрэбу ў пастаянным дынамічным удасканаленні.

— Прэзідэнт арыентуе беларускіх навукоўцаў быць дальнабачнымі і ўлічваць сусветныя тэндэнцыі. Кіраўнік дзяржавы аддае асаблівую ўвагу гэтаму кірунку, паколькі мы павінны не проста жыць і працаваць, а ўмець адаптавацца да сусветных выклікаў, развівацца ў перспектыўных галінах. Гаворка ідзе пра эканоміку, нацыянальную бяспеку, пра будучыню нашага народа і пра нашу краіну ў цэлым, — падкрэсліў ён.

### НАВУКА — АСНОВА ЭКАНАМІЧНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ І ЗАМОЖНАСЦІ ЛЮБОЙ ДЗЯРЖАВЫ



У гэтым перакананы **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.**

— Вялікая ўвага, якую надае кіраўнік дзяржавы развіццю навукі і яе ўзаемасувязі з практыкай, цалкам абгрунтавана, — перакананы суразмоўнік. — Беларусь не мае вялізных запасаў прыродных выкапняў, продаж якіх прыносіць велізарныя грошы ў дзяржаўную казну. Наша галоўнае багацце — гэта людзі, наш з вамі інтэлект і наша з вамі праца.

> **Навука ж стаіць у авангардзе развіцця любога грамадства. Сусветны вопыт сведчыць, што эканомікі дзяржаў развіваюцца за кошт укаранення вынікаў навейшых навуковых і тэхналагічных распрацовак. Навука — аснова эканамічнай стабільнасці і заможнасці любой дзяржавы, якая дбае пра свой суверэнітэт і будучыню.**

Ён звяртае ўвагу, што якаснае развіццё навукі і максімальная практычная аддача ад навуковых даследаванняў — гэта таксама аснова нацыянальнай бяспекі:

— Таму падыход павінен быць разумным і ўзважаным, мы павінны зыходзіць з тых інтэлектуальных, матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў, якія маем, і выкарыстоўваць іх максімальна эфектыўна.

Суразмоўнік адзначае і тое, што надзвычай надзённымі пытаннямі з'яўляюцца практыкаарыентаванасць навукі, укараненне навуковых распрацовак у эканоміку і сацыяльную сферу, забеспячэнне тэхналагічнага суверэнітэту праз імпартазамяшчэнне і экспарт навукова-тэхнічнай прадукцыі:

— Акадэмічная, галіновая, універсітэцкая сферы навукі павінны дзейнічаць зладжана, узаемадапаўняючы адна адну. Нельга не адзначыць, што Нацыянальная акадэмія навук — гэта сэрца айчыннай навукі, сапраўдная навукова-вытворчая карпарацыя. Таму менавіта Акадэмія навук павінна забяспечыць разам з зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі адпаведную якасную каардынацыю з выразным акцэнтам на канкрэтныя вынікі.

Парламентарый таксама адзначае важнасць павышэння адказнасці галіновых заказчыкаў у справе арганізацыі праграм навуковых даследаванняў і ўкаранення іх вынікаў.

— Разам з тым неабходна максімальна актывізаваць супрацоўніцтва з вучонымі нашых стратэгічных партнёраў — Расіі і Кітая. Усё гэта — вялікая шматпланавая праца па якасным адладжванні сістэмы айчыннай навукі, — перакананы дэпутат.

### ДАСЯГНЕННІ ПАПЯРЭДНІКАЎ ПАВІННЫ НАТХНЯЦЬ СУЧАСНІКАЎ



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Таццяна ІГНАЦЮК** упэўнена: Прэзідэнт задаў усім, і перш за ўсё навуковай супольнасці, выразны і магутны вектар:

— Навука — не вежа са слановай косці. Гэта жывы арганізм, чые адкрыцці і распрацоўкі павінны знаходзіць увасабленне ў рэальнай эканоміцы, у паляпшэнні жыцця кожнага беларуса, — падкрэслівае парламентарый.

На яе думку, гістарычны кантэкст, пра які мы не маем права забываць, літаральна абавязвае нас да найвышэйшай патрабавальнасці:

— Наша зямля дала свету такіх тытанаў думкі, як Ігнат Дамейка, чые працы ляглі ў аснову геалогіі Чылі, Мікалая Судзілоўскага, чые ідэі апярэдзілі час, Браніслава Тарашкевіча, стваральніка першай навуковай граматыкі беларускай мовы... У сценах Акадэміі навук БССР каваўся інтэлектуальны шчыт і меч рэспублікі: ад фундаментальных даследаванняў у фізіцы і матэматыцы да прарыўных распрацовак у галіне машынабудавання, электронікі, сельскай гаспадаркі, якія забяспечылі індустрыяльны рывок і тэхналагічную незалежнасць. Гэта спадчына — не музейны экспанат, а жывы эталон, па якім мы павінны мераць сённяшні дзень.

Яна выказала ўпэўненасць, што гэты дзень павінен адказваць усім сучасным рэаліям:

— На гэтым акцэнтаваў сваю ўвагу Аляксандр Рыгоравіч, заклікаўшы навуковую супольнасць да «паскарэння». Свет не чакае. Канкурэнцыя глабальная. Нам патрэбныя не проста добрыя ідэі — нам патрэбныя хуткія, эфектыўныя шляхі іх трансфармацыі ў тэхналогіі, у новыя вытворчасці, у канкурэнтаздольную прадукцыю. Навукоўцы акадэміі валодаюць каласальным патэнцыялам — важна стварыць усе ўмовы, каб гэты патэнцыял рэалізоўваўся імкліва і з максімальнай карысцю для краіны.

Суразмоўніца канстатуе: навука не павінна задавальняцца імгненным:

— Нам патрэбныя прарывы, фундаментальныя даследаванні, якія закладваюць аснову для развіцця Беларусі на дзесяцігоддзі наперад. Гэта пытанне нашай тэхналагічнай незалежнасці, нашага суверэнітэту ў самым высокім сэнсе слова. Інвестыцыі ў навуку сёння — гэта інвестыцыі ў заўтрашні дзень нашых дзяцей.

Сенатар падкрэслівае, што праведзеная нарада — не кропка, а магутны старт:

— Яна зноў пацвердзіла: Нацыянальная акадэмія навук — не проста ўстанова, а стратэгічны рэсурс развіцця Беларусі. Наша агульная задача — зрабіць гэты рэсурс максімальна эфектыўным, які адказвае высокім патрабаванням часу і лідарскай волі кіраўніка дзяржавы. Упэўнена, навуковая супольнасць успрыме гэты выклік з годнасцю і адказнасцю. Будучыня пачынаецца сёння, і яна павінна быць напісана нашымі навукоўцамі.

### НЕАБХОДНА, КАБ МОЛАДЗЬ ІШЛА Ў НАВУКУ



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Алег РАМАНАЎ** звяртае ўвагу на тое, што падчас нарады па рэфармаванні Акадэміі навук Беларусі Прэзідэнт выказаў некалькі прынцыпова важных тэзісаў:

— Першы з іх заключаецца ў тым, што неабходна мяняць арганізацыйную структуру, сістэму кіравання навукай, — звяртае ўвагу суразмоўца. — Справа ў тым, што навукова-тэхнічная рэвалюцыя — гэта не столькі дасягненне ў навуцы, тэхніцы, гэта ўсталяванне ўстойлівай сувязі паміж навукай і вытворчасцю, навукай і грамадствам, сацыяльнай сферай, калі навуковыя дасягненні бясшвова пераходзяць у практыку.

На думку парламентарыя, менавіта стварэнне сістэмы бясшовага пераходу — асноўная задача, якая стаіць перад беларускай навукай і якая абмяркоўвалася на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы:

> **— Прэзідэнт вельмі правільна разумее, што тут нельга сячы з-за пляча, прымаць радыкальныя рашэнні, тут неабходна наладжваць сістэму падрыхтоўкі навукоўцаў і ствараць арганізацыйную структуру, што садзейнічае засваенню навуковых адкрыццяў грамадствам.**

Таксама Алег Раманаў звярнуў увагу на ідэю падрыхтоўкі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі:

— Гэта вельмі важная праблема. Стаіць задача вярнуць навуцы той прэстыж, які, трэба прызнаць, яна некалькі разгубіла ў апошнія гады і дзесяцігоддзі. Неабходна зрабіць так, каб моладзь ішла ў навуку, каб гэта было прэстыжна, каб найбольш таленавітыя ішлі не толькі ў IT-сектар або ў гандлёвы бізнес, у іншыя высокапрыбытковыя сферы дзейнасці, а каб таленавітая моладзь ішла ў навуку і менавіта там шукала сваё месца, рэалізоўвала свой талент.

**Фота БелТА.**



ПА СУТНАСЦІ

# ТВОЙ ВЫХАД, МОЛАДЗЬ!



**Краіна сустракае маладую змену. Пакаленне, выпеставанае дзяржавай. Маладыя спецыялісты, якія прыйшлі на сваё першае працоўнае месца. Нашы людзі, нашы калегі. І з імі нам будаваць будучыню, а пасля менавіта на іх плечы пакідаць краіну. Кіраўнікі вялікіх прадпрыемстваў і цэлых раёнаў сустракаюцца з маладымі спецыялістамі, ім адразу даюцца розныя льготы, вырашаецца жыллёвая праблема... Але ці ўсе з іх разумеюць, што гэта гульня не ў адны вароты, што ад іх чакаюць адказнай працы, як мінімум, і жадання развівацца ў прафесіі?**

«Без цяжкасцей і з вялікімі заробкамі». Прычым усё і адразу. Кажуць, аб гэтым зараз не мараць, гэта зараз патрабуюць некаторыя маладыя. Так не бывае? Напэўна, не тыя казкі і прымаўкі яны чулі ў дзяцінстве.

Я добра памятаю сябе маладым. Як у калектыве ты адчуваў сябе навічком, як без слоў разумеў, што начное дзяжурства, выхадны дзень — на працы за табой. Ды і самому было цікава — нырнуць у прафесію з галавой... Пра тое ж арэнднае жыллё нават і рот на адкрываў — радаваўся проста, што працую ў камандзе, што зарплату атрымліваю. Разумеў, каб яна была большай, — трэба працаваць, развівацца.

Сёння маладых калег мы сустракаем як імяніннікаў, як герояў. І некаторыя думаюць: так і ёсць, не саромеюцца ні сваіх амбіцый, ні сваіх памылак, ні свайго няведання. Затое свае правы ведаюць лепш за ўсіх, за нас старэйшых. Лішняя хвіліна на працы — прычына незадаволенасці і нагода згадаць Працоўны кодэкс. І тут нават размова не пра адданасць ідэі, калектыву, краіне (час энтузіястаў, кажуць, незваротна мінуў). Тэма іншая, зусім прагматычная: каб зарабляць больш, трэба станавіцца лепшым спецыялістам. А як гэта зрабіць без жадання вучыцца і ўдасканальвацца?

А гарантаванае першае працоўнае месца — хіба не надзейная кропка апоры? Не, некаторыя ўпэўнены: я прыйшоў на адпрацоўку — таму я герой. Пачакай, герой. Не адразу гартавалася сталь. Калі незразумелая ідэя служэння — вось прагматычны і жалезны аргумент. Паважаны сябра, ты пакуль вяртаеш грошы, укладзеныя дзяржавай у тваё веды. Немалыя грошы. І не толькі з кішэняў тваіх бацькоў. Таму кожны вывучаны на бюджэтнай аснове ўрач, міліцыянер, інжынер, журналіст павінен кожнаму працоўнаму беларусу. Таму вымушаны рабіць сваю справу ад душы, не ўмееш — старанна авалодвай прафесіяй. Гэта па-першае. Па-другое, першае працоўнае месца — гэта бонус сацыяльна арыентаванай эканомікі. Можа, дзяржаве пайсці на эксперымент і для вялікіх «нехачух» з дыпломамі за дзяржаўны кошт прапанаваць самім уладкоўвацца на працу, праз конкурсы, праз выпрабавальныя тэрміны, якія не факт што вытрымаеш. Грошы за навучанне канешне давядзецца вярнуць. А што — справядліва! Такія ж прагматычныя адносіны да фанафанабэрыстых выпускнікоў, як у іх да адказнасці перад дзяржавай.

Бо стан дарослацсі — гэта адказнасць. Замест пубертальнага «мне ўсе павінны», замест дзёрзкага «я сам ведаю», суровае і жыццёвае: «ты адказваеш». Але да той адказнасці яшчэ трэба дарасці...

І самае галоўнае, малады спецыяліст, — менавіта ад цябе залежыць будучыня краіны. У якіх абставінах будзе жыць твая сям'я, будуць гадавацца твае дзеці. Мірнае альбо хмурнае неба будзе над тваёй галавой з моднай прычоскай. Не ад непасрэднага начальніка, не ад «біг боса» з вышэйшага паверха, не ад міністра. Ад цябе! Можна памыляцца, не ведаць, але нельга быць абыякавым да справы. У свеце — цяжка. Як ніколі. Нам, нашай краіне, трэба заваёўваць і трымаць міжнародныя рынкі, нягледзячы на складанасці, якія нам падкідваюць санкцыйнымі пакетамі. Гэты чарговы віток турбулентнасці расставіць краіны па новых месцах. І гэта вызначыць развіццё кожнай з дзяржаў на дзесяцігоддзі наперад. А яшчэ зараз упершыню за гісторыю чалавецтва, кінуты антрапалагічны выклік. Чалавек, сям'я, дзяржава — апынуліся пад ударам. І час зараз нялёгкі. Як кажа моладзь, ад слова зусім.

Але гэта і час магчымасцяў, асабліва для маладых. Дзяржава робіць усё залежнае ад яе. І дзяржава на цябе спадзяецца і разлічвае. Твой выхад, моладзь, зрабі ёй крок насустрач.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# З УЛІКАМ ПАТРАБАВАННЯЎ ЧАСУ І ЧАКАННЯЎ ГРАМАДЗЯН

## 13 законапраектаў унесена ў парадак дня трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў




**Графік падрыхтоўкі законапраектаў, а таксама перспектывы міжнароднай дзейнасці дэпутацкага корпуса, вынікі работы парламентарыяў у выбарчых акругах абмяркавалі падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў.**

З 67 разгледжаных на папярэдняй сесіі законапраектаў 64 прыняты ў другім чытанні, падпісаны Прэзідэнтам і прымяняюцца на практыцы. Тры законапраекты разгледжаны ў першым чытанні і актыўна дапрацоўваюцца да другога чытання. Важным фактарам, які забяспечвае такую рэзультатыўнасць, з'яўляецца планамернасць і эфектыўнасць работы з законапраектамі, адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** і заўважыў, што ў такім жа ключы павінна ісці падрыхтоўка да трэцяй сесіі. «Цяпер у Палату прадстаўнікоў унесена 13 законапраектаў, 12 з якіх ужо ўключаны ў прыкладны графік падрыхтоўкі для разгляду на трэцяй сесіі, — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Хачу звярнуць чарговы раз увагу, што пастаянныя камісіі павінны дакладна прытрымлівацца тэрмінаў, устаноўленых у гэтым графіку».

У прыватнасці, Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы даручана сур'ёзную ўвагу ўдзяліць дапрацоўцы да другога чытання праекта Закона «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання». Гэта абсалютна новы законапраект. Прапанаваныя навацыі павінны забяспечыць эфектыўную работу бізнесу на карысць краіны і яе грамадзян. Што датычыцца падрыхтоўкі законапраектаў, звязаных з адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасцю, спікерам пастаўлена задача — ісці па шляху далейшай лібералізацыі адказнасці, у той жа час не захапляцца празмерным змякчэннем пакарання там, дзе гэта не патрабуецца.

Пастаўлена задача асаблівую ўвагу ўдзяліць удзелу ў распрацоўцы пакета бюджэтных дакументаў на 2026 год. «Гэта работа ўжо актыўна вядзецца, і дэпутаты павінны прымаць у ёй самы актыўны ўдзел», — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Важным кірункам дзейнасці дэпутатаў з'яўляецца актыўная работа над законапраектамі да ўнясення іх у Палату прадстаўнікоў. «Нязменнай задачай застаецца практыка правядзення практыкаарыентаваных мерапрыемстваў, — звярнуў увагу спікер. — Такія мерапрыемствы — выязныя пасяджэнні пастаянных камісій, круглыя сталы, іншыя мерапрыемствы па вывучэнні правапрымяняльнай практыкі — павінны мець практычную карысць, вынік, быць добрай дапамогай у падрыхтоўцы якасных, выверананых, збалансаваных дакументаў, якія адказваюць патрабаванням часу, чаканням грамадзян і юрыдычных асоб».

Кажучы аб міжнароднай дзейнасці дэпутацкага корпуса, сярод шэрага бліжэйшых планаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў агучыў, што ў пачатку верасня пад эгідай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі ў Магілёве будзе праведзены маладзёжны фестываль, які дагэтуль заўсёды праходзіў у Смаленску. У рамках фестывалю запланаваны форум маладых гісторыкаў.

Рэзюмуючы, Ігар Сергяенка заклікаў дэпутатаў да актыўнай, канкрэтнай і дакладнай працы падчас трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання, якая, згодна з Канстытуцыяй, пачне работу ў трэці аўторак верасня.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

Дарэчы

## У склад новай камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па захаванні і абароне гістарычнай памяці ўвойдуць шэсць беларускіх парламентарыяў

**Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Вадзім ІПАТАЎ** у размове з журналістамі нагадаў, што падчас пасяджэння 68-й сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, якое ў чэрвені адбылося ў Брэсце, было прынята рашэнне аб стварэнні Камісіі па захаванні і абароне гістарычнай памяці. Пытанне аб кандыдатах у гэту камісію з беларускага боку было разгледжана ў сераду падчас Савета Палаты прадстаўнікоў.

«Дзейнасць створанай камісіі будзе накіравана на захаванне гістарычнай памяці, абарону гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне, Другой сусветнай вайне, — адзначыў Вадзім Іпатаў. — Нівеліруецца подзвіг нашых людзей у Вялікай Айчыннай вайне, і гэтаму неабходна процідзейнічаць усімі даступнымі сродкамі і спосабамі. Гэтым і будзе займацца камісія ў межах дзейнасці Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Ад нашага Нацыянальнага сходу ў яе склад увойдзе шэсць прадстаўнікоў».

# ЦІШЭЙ ЕДЗЕШ — ДАЛЕЙ БУДЗЕШ!

## САМАКАТ АБО МЕХАНІЧНЫ ТРАНСПАРТНЫ СРОДАК?

«У апошнія гады мы сталі сведкамі актыўнага выкарыстання ўдзельнікамі дарожнага руху сродкаў персанальнай мабільнасці. Таксама ўзрастае цікавасць да веларуху. Пры гэтым развіццё такога віду транспарту цягне за сабой і негатыўныя моманты. У першую чаргу гэта звязана з траўміраваннем людзей, якія перамяшчаюцца на гэтых сродках, а таксама ні ў чым не вінаватых пешаходаў. Не сакрэт, што многія так званыя сродкі персанальнай мабільнасці маглі развіваць хуткасць і да 50 кіламетраў у гадзіну, а то і больш», — занатаваў **начальнік галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС Віктар РОТЧАНКАЎ.**



Паводле яго слоў, за апошнія два гады было зафіксавана 900 ДТЗ з веласіпедыстамі альбо асобамі, якія перамяшчаліся на сродках персанальнай мабільнасці. «Асабліва ўсплёск ДТЗ адбыўся ў 2024 годзе, калі на 80 % узрасла колькасць аварый з удзелам асоб, якія перамяшчаліся на сродку персанальнай мабільнасці. За мінулы год загінулі чатыры такія ўдзельнікі дарожнага руху. За першае паўгоддзе 2025 года яшчэ на 30 % вырасла колькасць аварый з удзелам дадзенай катэгорыі. Тры ўдзельнікі дарожнага руху, якія ехалі на сродках персанальнай мабільнасці, загінулі».

З улікам усіх абставін МУС краіны выступіла з ініцыятывай аб неабходнасці карэкціроўкі асобных палажэнняў ПДР. Тады сумесна з зацікаўленымі дзяржорганамі Дзяржаўтаінспекцыяй была праведзена вялікая работа. «Вынікам стала падпісанне 4 жніўня кіраўніком дзяржавы Указа № 295, які прадугледжвае карэкціроўку асобных палажэнняў ПДР, што ўступаюць у сілу з 1 верасня 2025 года. Па-першае, было скарэкціравана значэнне самога паняцця «сродак персанальнай мабільнасці». Гэты транспартны сродак мае адно або некалькі колаў і максімальна канструктыўную хуткасць руху не большую за 25 кіламетраў у гадзіну. Ён прызначаны для руху аднаго чалавека з дапамогай выкарыстання электрарухавіка. Асобы, якія перамяшчаюцца на сродках персанальнай мабільнасці, прыраўноўваюцца да веласіпедыстаў. Гэта значыць, менавіта канструктыўная хуткасць, устаноўленая заводам-вытворцам, цяпер з'яўляецца вызначальнай. Калі ў нас няма дадзеных аб вытворцы, многае будзе ўстанаўлівацца згодна з экспертызай. Транспартныя сродкі, якія могуць развіваць хуткасць звыш 25 кіламетраў у гадзіну, будуць прызнавацца альбо мапедам, альбо матацыклам. Іх неабходна будзе зарэгістраваць», — адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення ДАІ.

Ва ўказе прапрацаваны і спрошчаны парадак рэгістрацыі. «Асобы, у якіх ёсць сродак, што па сваіх характарыстыках можа развіваць хуткасць, большую за 25 кіламетраў у гадзіну, могуць у спрошчаным парадку яго зарэгістраваць. Для гэтага неабходна прадаставіць сродак у выпрабавальную лабараторыю, якая з'яўляецца рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і ўключана ў Адзіны рэестр органаў па ацэнцы адпаведнасці ЕАЭС. Па выніках ацэнкі, калі ён адпавядае той ці іншай катэгорыі механічнага транспартнага сродку, афармляецца электронны пашпарт. Толькі з гэтым электронным пашпартам мы ажыццяўляем рэгістрацыю дадзенага сродку. Спрошчаны парадак будзе дзейнічаць да 1 верасня 2026 года, — падкрэсліў Віктар Ротчанкаў. — Асобам, якія не захочуць рэгістраваць такія сродкі, дазволена ўдзельнічаць у руху на дарогах без удасканаленага пакрыцця. Пры гэтым для кіравання дадзенымі транспартнымі сродкамі ўсё роўна спатрэбіцца вадзіцельскае пасведчанне адпаведнай катэгорыі. Некаторым уласнікам такіх сродкаў прыйдзецца дадаткова іх абсталяваць. Гэта могуць быць паказальнікі павароту, светлавыя прыборы і гэтак далей».

Рэгістрацыя СПМ будзе праводзіцца ў такія ж тэрміны, як і звычайных механічных транспартных сродкаў. «Калі ўладальнік прыбудзе да нас з неабходнымі дакументамі — электронным пашпартам, то ўсё будзе зроблена максімальна хутка і лаканічна, — заявіў кіраўнік дарожнай міліцыі. — Не да канца зразумелае пытанне з праходжаннем выпрабавальнай лабараторыі і атрыманнем электроннага пашпарта. Тут адзінага алгарытму мы назваць яшчэ не можам. У кожнага гэта зойме свой пэўны час. Бо цяжка сказаць, ці спатрэбіцца механічнаму транспартнаму сродку дадатковыя дапрацоўкі яго тэхнічнага абсталявання, ці адпавядае ён у поўнай меры тэхнічнаму рэгламенту па бяспецы, ці спатрэбіцца дапрацоўка альбо ўдакладненне нейкіх параметраў. Таму я не магу даць адназначнага адказу. Рэгістрацыі будзе падлягаць шмат мадэляў тэхнікі, у кожнай — свае асаблівасці». Праваахоўнік дадаў таксама, што ўладальнікі такіх транспартных сродкаў могуць звяртацца па рэгістрацыю ў падраздзяленні ДАІ, не чакаючы 1 верасня, — Дзяржаўтаінспекцыя ўжо прыступіла да рэгістрацыі.

## ЦЯПЕР СПЕШВАЕМСЯ! АЛЕ ЦІ ЗАЎСЁДЫ?

Сярод новых нормаў пры перамяшчэнні на сродку персанальнай мабільнасці — забарона на рух у населеным пункце з хуткасцю больш за 10 кіламетраў у гадзіну, за выключэннем руху па веласіпедных дарожках або праезнай частцы дарогі. Таксама забараняецца рухацца ў пешаходнай зоне, якая пазначана адпаведнымі дарожнымі знакамі. Акрамя таго, нельга рухацца па тратуары, калі маса сродкаў персанальнай мабільнасці перавышае 35 кілаграмаў. Нельга пакідаць СПМ у месцах, дзе гэта стварае перашкоды для іншых удзельнікаў дарожнага руху.

> **«Акрамя таго, у адпаведнасці з новымі патрабаваннямі Правілаў дарожнага руху, перад перасячэннем праезнай часткі веласіпедысты і кіроўцы СПМ абавязаны спешвацца і пераходзіць яе з выкананнем патрабаванняў, прадугледжаных для руху пешаходаў», — падкрэсліў Віктар Ротчанкаў.**

Ёсць і выключэнні. Калі на велапераездзе ёсць святлафор, які рэгулюе рух веласіпедыстаў, то ў гэтым выпадку яны маюць права не спешвацца. Калі веладарожка ідзе ўздоўж праезнай часткі і веласіпедыст перасякае скрыжаванне ці яшчэ нешта, то ён можа таксама не спешвацца, але пры гэтым павінен выконваць патрабаванні дарожных святлафораў і знакаў, якія ўстаноўлены на гэтым скрыжаванні. Ён мае права не спешвацца і пры руху па лініі тратуараў або ўзбочын, саступаючы дарогу іншым транспартным сродкам. «У асноўным у сельскай мясцовасці бывае так, што або тратуар, або ўзбочыны ідуць уздоўж жылой зоны, і праз кожныя 20-30 метраў ёсць перасячэнні, выезд з жылой зоны. Пры гэтым няма ні пешаходнага пераходу, ні велапераезду. У гэтым выпадку веласіпедыст мае права не спешвацца, але ён павінен у абавязковым парадку саступіць дарогу аўтамабілю», — тлумачыць праваахоўнік.

Захаванне хуткаснага рэжыму на веладарожцы, паводле яго слоў, таксама будзе знаходзіцца на асаблівым кантролі. «Тыя тэхнічныя сродкі вымярэння хуткасці, якія сёння ёсць у супрацоўнікаў ДАІ, ужо дазваляюць рабіць вымярэнні хуткасці ўдзельнікаў дарожнага руху. Калі адбываліся ДТЗ, нам нічога не перашкаджала эксперыментальным шляхам разлічыць хуткасць. Відэааналітыка, якая прысутнічае ў гарадах, дазваляе нам гэта вызначыць, — растлумачыў кіраўнік Дзяржаўтаінспекцыі. — Тэхналогіі не стаяць на месцы, яны развіваюцца. Пастаўшчыкі абсталявання для аўтаматычнай фіксацыі праваапарушэнняў, такіх як праезд на забараняльны сігнал святлафора або іншых, ужо гатовыя перадаваць тэхніку і для фіксацыі хуткасці. Мы працуем над гэтым пытаннем».

Адказнасць за парушэнне ПДР карыстальнікамі СПМ прадугледжана артыкулам 18.20 КаАП, які складаецца з чатырох частак. «У тым ліку асобна прадугледжана адказнасць за парушэнне Правілаў дарожнага руху ў стане ап'янення, — акцэнтаваў Віктар Ротчанкаў. — Фактычна тую адказнасць, якую на сённяшні дзень нясе пешаход, будзе несці па гэтым артыкуле кіроўца, які перамяшчаецца на сродку персанальнай мабільнасці, на веласіпедзе».

## РУХ У САДАВОДЧЫХ ТАВАРЫСТВАХ, ТАНІРОЎКА АЎТАМАБІЛЯ І ЯЗДА НА МАТАБЛОКУ

Таксама быў вызначаны тэрмін «механічны транспартны сродак», унесены карэкціроўкі яго вызначэння. Былі вызначаны і транспартныя сродкі, якія не адносяцца да механічных. «Да механічных транспартных сродкаў не адносяцца СПМ, веласіпеды, якія маюць электрарухавік намінальнай максімальнай магутнасцю ў рэжыме працяглай нагрузкі, што не перавышае 250 ват, або максімальную канструктыўную хуткасць руху, вызначаную яго тэхнічнай характарыстыкай не больш за 25 кіламетраў у гадзіну. Таксама не адносяцца да механічных транспартныя сродкі, якія прыводзяцца ў рух рухавіком, максімальная канструктыўная хуткасць якіх перавышае 25 кіламетраў у гадзіну, якія маюць масу менш за 35 кілаграмаў і на якіх адсутнічае сядзенне і рулявое кіраванне», — паведаміў Віктар Ротчанкаў.

Таксама былі ўдакладнены палажэнні Правілаў дарожнага руху ў частцы тэрыторыі садаводчых таварыстваў. Цяпер яны аднесены да жылой зоны. «Ад насельніцтва паступалі пытанні аб тым, як таварыствы візуальна вызначаюцца. Гэта могуць быць, напрыклад, вароты, шлагбаум. Унутры вызначаны парадак паводле азначэння жылой зоны. Гэта значыць, пешаходы і веласіпедысты, СПМшчыкі маюць прыярытэт пры руху сумесна з аўтамабілем. Але пры гэтым яны не павінны наўмысна перашкаджаць руху, — падкрэсліў кіраўнік Дзяржаўтаінспекцыі. — У выпадку неабходнасці ўладальнікі садаводчых таварыстваў маюць права звярнуцца ў Дзяржаўтаінспекцыю для ўзгаднення па ўстаноўцы знакаў жылой зоны: «Пачатак жылой зоны», «Канец жылой зоны». Знакі могуць ўстанаўлівацца і прыводзіцца ў адпаведнасць».

А яшчэ ў сувязі са шматлікімі зваротамі грамадзян замацавана магчымасць руху на матаблоку з прычэпам, дадаў Віктар Ротчанкаў. Такі рух дапускаецца ў светлы час сутак, па ўзбочыне дарогі, дзе хуткасць не перавышае 90 кіламетраў у гадзіну. Пры адсутнасці ўзбочыны — не далей аднаго метра ад краю праезнай часткі. Цяпер на матаблоках афіцыйна дазволена перамяшчацца.

Змяненні былі ўнесены і ў Дадатак 4 ПДР, дзе пазначаны няспраўнасці, пры якіх забаронены ўдзел у дарожным руху. «У прыватнасці, дазволена таніроўка, нанясенне плёначных пакрыццяў, устаноўка штор на задніх бакавых і заднім шкле аўтамабіля. Прычым нейкая норма па святлопрапускальнасці не ўстаноўлена. Нароўні з гэтым дазволам ДАІ будзе вельмі пільную ўвагу ўдзяляць спыненню правапарушэнняў, калі кіроўцы наносяць плёначныя пакрыцці на пярэдняе і пярэдняе бакавое шкло аўтамабіля. У дадзеным выпадку гэта парушэнне Правілаў дарожнага руху, за што прадугледжана адказнасць. Цяпер мы будзем займаць больш прынцыповую і жорсткую пазіцыю па гэтым пытанні».



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Таксама прыведзена ў адпаведнасці з тэхнічным рэгламентам выкарыстанне зімовых шын. Так, зімой будзе забаронена выкарыстоўваць шыны, якія маюць абрэвіятуру «all season» — усе сезоны. Іх можна выкарыстоўваць з вясны да восені, але ў зімовы перыяд варта ўжываць толькі зімовыя шыны, якія пазначаны адпаведным чынам.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**ООО «Реалконсалтинг»**
**извещает о проведении открытого аукциона № 24/25 по продаже помещений в Минске**

Предмет аукциона: лот № 1 –
**Изолированные помещения, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 144.**
**- Инвентарный номер 500/D-707952073 (пом. 17), площадь – 153,9 кв. м, наименование – Административное помещение.**
**- Инвентарный номер 500/D-707952072 (пом. 16), площадь – 4,0 кв. м, наименование – Помещение неустановленного назначения.**
Обременение: ипотека.
Начальная цена лота – 221 000 долларов США

Аукцион проводится **09.09.2025 с 10.00 до 16.00** в форме электронного аукциона на электронной торговой площадке «РЕАЛТОРГИ» по адресу: https://realtorgi.by (далее – ЭТП).
**Заявки на участие в аукционе принимаются по 08.09.2025 включительно до 17.00**

**Для участия в аукционе необходимо:**
1. внести задаток в размере 300 рублей на расчетный счет BY53MTBK 30120001093300098542 в ЗАО «МТБанк», БИК MTBKBY22, УНП 191302068, получатель платежа – ООО «Реалконсалтинг», назначение платежа – «Задаток для участия в аукционе № 24/25»;
2. пройти регистрацию на ЭТП и подать заявку на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Регламентом ЭТП

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом ЭТП (размещен по адресу: https://realtorgi.by/reglament-etp). Подавая заявку на участие в аукционе, участник аукциона принимает условия размещенного на странице лота (вкладка «Договор и документы») соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения электронного аукциона, устанавливающего права, обязанности и ответственность участника аукциона.
Победителем аукциона объявляется участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона: 5 процентов от начальной цены. В случае если заявка на участие по лоту подана только одним участником (далее – единственный участник), лот продается этому участнику с его согласия по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона) возмещает организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.
Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.
Продажа предмета аукциона осуществляется по цене, сложившейся по результатам аукциона, в белорусских рублях, исходя из официального курса белорусского рубля по отношению к доллару США, установленного Национальным банком Республики Беларусь на дату оплаты предмета аукциона.
Победителю аукциона (единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов) внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи предмета аукциона, другим участникам – возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона

**Организатор аукциона, оператор ЭТП и продавец предмета аукциона: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068, г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. тел.: +375 (17) 256 61 35, +375 (25) 549 86 22; auction@expertiza.by, https://www.expertiza.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Молодечненский райагросервис»**
(*продавец, местонахождение: Минская область, г. Молодечно, ул. Лебедевская, 8*)
проводит повторный открытый аукцион

по продаже **трактора К-744Р,**
**2006 г. в., рег. знак ОО-5 0334, инв. № по бух. учету 90261, зав. № 050778.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 50 886,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 5 088,00 бел. руб.**
**Стоимость снижена на 45 %.**
**Объект находятся по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Лебедевская, 8.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.
**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**
Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.
Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 23.08.2024, 22.11.2024, 05.04.2025, 22.05.2025.
Электронные торги состоятся **20.08.2025** в **10.00.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.08.2025** до **17.00**.
**Тел. организатора торгов: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (8033) 340-21-83.**
**Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by.**
УНН 600077381


# НЕ ТОЙ РАЗЛІК

## Што паказалі вынікі дзейнасці падатковых органаў па спыненні фактаў выплаты заработнай платы «ў канвертах»?



У 2025 годзе падатковымі органамі была працягнута комплексная работа па выяўленні даходаў, утоеных ад падаткаабкладання і якія выкарыстоўваюцца ў якасці крыніц выплаты заработнай платы «ў канвертах», паведамілі ў профільным міністэрстве.

Па-ранейшаму асноўным спосабам фарміравання крыніцы для выплаты заработнай платы «ў канвертах» застаецца ўтойванне ад падаткаабкладання наяўнай выручкі. За 1-е паўгоддзе 2025 года падатковымі органамі ў ходзе правядзення аператыўных мерапрыемстваў устаноўлена ўтоеная суб'ектамі гаспадарання ад падаткаабкладання наяўная выручка ў суме 106,5 мільёна рублёў.

— Улічваючы, што прыярытэтам у нашай рабоце з'яўляецца забеспячэнне кантролю за правільнасцю, паўнатой вылічэння і своечасовасцю выплаты падаткаў у бюджэт не фіскальнымі мерамі, а за кошт прафілактычнай работы, на адрас суб'ектаў гаспадарання ў мінулым перыядзе 2025 года накіравана больш за 39 тысяч паведамленняў і апавяшчэнняў, у якіх прапанавана добраахвотна ліквідаваць парушэнні або даць адпаведныя тлумачэнні. Сума падаходнага падатку з фізічных асоб, які падлягае даплаце ў бюджэт, склала 31,4 мільёна рублёў, — пракаментавалі ў профільным ведамстве.

Па выніках праверак, праведзеных падатковымі органамі, устаноўлена 448 фактаў нявыплаты падаходнага падатку і прад'яўлена да выплаты 70,9 мільёна рублёў дадзеных плацяжоў з фізічных асоб.

— Работа па прафілактыцы здзяйснення парушэнняў, а таксама па іх выяўленні і спыненні працягваецца, — дапоўнілі ў МПЗ.

# НА НОВАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ І Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ

## Выстава «Лесдрэўтэх» пройдзе ў Беларусі з 15 да 18 кастрычніка

Упершыню Міжнародная спецыялізаваная выстава-кірмаш пройдзе ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. Арганізатары форуму — а гэта Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь і дзяржаўнае прадпрыемства «БелЭкспа» — рыхтуюць насычаную дзелавую і выставачную праграму, паведамілі ў прэс-службе профільнага міністэрства.

На выставе свае экспазіцыі прадставяць арганізацыі лясной гаспадаркі і сумежных галін. У прыватнасці, будуць прэзентаваныя экспартныя магчымасці лясгасаў, найноўшае абсталяванне і тэхніка для лесанарыхтовак і дрэваапрацоўкі і многае іншае.

Чакаецца, што ў выставе-кірмашы прымуць удзел і замежныя ўдзельнікі.

Прыемным падарункам для гасцей форуму стане і разнастайная культурная праграма.



# ДЭБЮТНЫ ДУЭТ НОВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ ПАДТРЫМКІ

## Банк развіцця прафінансуе будаўніцтва пладасховішчаў і праект прамысловай іпатэкі



Фінансавая ўстанова ўпершыню ў сваёй практыцы правяла конкурсны адбор інвестыцыйных праектаў па будаўніцтве сучасных пладасховішчаў і падпісала першы крэдытны дагавор у рамках прамысловай іпатэкі, паведамілі ў банку.

У вясноваа-летні перыяд традыцыйна назіраецца павышаны попыт на пладовую прадукцыю: можна сказаць, гароднiна і садавіна прама з палёў і градак дастаўляецца спажыўцу. Зімой попыт задавальняе вітамінная прадукцыя, пакінутая на захоўванне. Каб павялічыць тэрміны дадзенага працэсу без страты якасці прадукцыі, неабходныя сучасныя пладасховішчы.

— Вясной сёлета Банкам развіцця быў аб'яўлены першы конкурсны адбор інвестыцыйных праектаў па будаўніцтве і мадэрнізацыі пладасховішчаў. Камфортныя ўмовы выдачы фінансавай падтрымкі — імпульс да дзеяння для сельгасарганізацый. Пераможцам адбору прызнана ТАА «Арніка-Агра», — пракаментавалі ў банку.

Прадпрыемства знаходзіцца ў Магілёве і вырабляе сельскагаспадарчую прадукцыю (вырошчвае яблыкі і ягады ў асартыменце) і ўносіць значны ўклад у фарміраванне стабілізацыйнага фонду краіны, пастаўляючы ў міжсезонны перыяд свае тавары ў гандлёвыя сеткі, прадпрыемствы грамадскага харчавання і сацыяльнай сферы.

На сённяшні дзень для захоўвання прадукцыі ў прадпрыемства ёсць пладасховішча агульнай ёмістасцю 10 тысяч тон, захоўванне прадукцыі ў якім магчыма да пяці месяцаў. Пры падтрымцы Банка развіцця «Арніка-Агра» мадэрнізуе дзве існуючыя халадзільныя камеры для 1000 тон пладовай прадукцыі з рэгуляваным газавым асяроддзем. Гэта дазволіць павялічыць тэрміны прыдатнасці тавару да 8-12 месяцаў.

Яшчэ адным дэбютам экасістэмы развіцця стаў інвестыцыйны праект індустрыяльнага парка «Вялікі камень» у рамках прамысловай іпатэкі. Гэты інструмент падтрымкі ў рэспубліцы з'явіўся адносна нядаўна. Яго сутнасць заключаецца ў стымуляванні суб'ектаў эканомікі для будаўніцтва і набыцця памяшканняў з наступным размяшчэннем там прамысловых вытворчасцяў.

У выпадку «Вялікага каменя» гэта ўзвядзенне дзесяцімодульнага ўніверсальнага вытворчага корпуса агульнай плошчай больш за 21,5 тысячы квадратных метраў для здачы ў арэнду малому і сярэдняму бізнесу з ліку рэзідэнтаў парка.

— У рамках праекта будзе пабудаваны высокааснашчаны будынак з прадуманым інжынерным забеспячэннем: магутнымі сістэмамі ацяплення, вентыляцыяй і электразабеспячэннем. Вытворчыя памяшканні будуць мець высокія столі і значную грузападымальнасць, што дазволіць выкарыстоўваць іх для розных галін прамысловасці. Акрамя таго, прадпрыемствы змогуць разлічваць на выгадныя ўмовы арэнды, што створыць дадатковыя стымулы для запуску новых вытворчых ліній, — паведамілі ў Банку развіцця.

Тут дадалі, што, акрамя галоўнага аб'екта, у рамках інвестыцыйнага праекта будзе створана неабходная інфраструктура: ад парковак і зарадных станцый да пляцовак адпачынку і добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі.

Пачатак будаўніцтва вытворчага корпуса плануецца самым бліжэйшым часам, а яго ўвод у эксплуатацыю — у снежні наступнага года. З пачатку 2027-га першыя вытворчасці пачнуць выпускаць прадукцыю прамысловасці на новых плошчах, якія адпавядаюць сусветным стандартам.

— Мэта дзейнасці Банка развіцця — падтрымка прыярытэтных для дзяржавы кірункаў, якія вызначаюць Прэзідэнтам і ўрадам. Гэтыя дзве дэбютныя падзеі наглядна дэманструюць, як у краіне ствараюцца прынцыпова новыя інструменты і практыкі для ўстойлівага развіцця ключавых галін эканомікі, — падсумавалі ў фінансавай установе.

# МАТЫВАВАНЫЯ НА ВУЧОБУ І РАЗВІЦЦЁ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Са шчаслівых уладальнікаў студэнцкіх білетаў — амаль дзясятая частка (каля 4,5 тысячы) — медалісты, 272 пераможцы і прызёры рэспубліканскіх алімпіяд, больш за 1,6 тысячы ўладальнікаў чырвоных дыпломаў каледжаў.

Мы пацікавіліся вынікамі ўступнай кампаніі ў некаторых буйных ВНУ краіны.

## БДУ: НАЙВЫШЭЙШЫЯ БАЛЫ НА «СУСВЕТНУЮ ЭКАНОМІКУ» І «МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА»

У БДУ на дзённую бюджэтную форму залічана 2607 абітурыентаў, з якіх 69 ваеннага факультэта. Сярод залічаных па выніках ЦТ і ЦЭ 95 працэнтаў абітурыентаў набралі 300 балаў і вышэй. 110 першакурснікаў — пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, лаўрэаты спецфондаў.

Без экзаменаў на педагагічныя кірункі залічаны 79 абітурыентаў. Сярэднюю школу з медалём або сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з дыпломам з адзнакай закончылі 922 чалавекі. Сярод залічаных — 1164 выпускнікі ліцэяў і гімназій, гэта 44,6 працэнта.

Сярод творчых спецыяльнасцяў самы высокі конкурс (сярод пададзеных заяў) на «Графічны дызайн і мультымедыядызайн» — 14,9 чалавека на месца.

Самыя высокія прахадныя балы сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцяў былі на «Прыкладную інфарматыку» — 391, «Інфарматыку» — 387, «Кібербяспеку» — 378, «Прыкладную матэматыку» — 371. Рэкордныя прахадныя балы сярод сацыяльна-эканамічных і гуманітарных спецыяльнасцяў адзначаны па «Сусветнай эканоміцы» — 398, «Міжнародным праве» — 398, «Міжнароднай эканоміцы і гандлі (з паглыбленым вывучэннем кітайскай мовы)» — 397.

На завочную бюджэтную форму залічаны 112 чалавек. Што датычыцца спецыяльнасцяў са скарочаным тэрмінам навучання, то прахадныя балы там наступныя: «Правазнаўства» — 204, «Медыка-біялагічная справа» — 193, «Кіраванне дакументамі» — 191. На спецыяльнасці біялагічнага факультэта завочнай бюджэтнай формы навучання прахадныя балы склалі: на «Біялогію» — 229, «Мікрабіялогію» — 224, «Біяхімію» — 224.

Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 2,01 чалавека на месца.

## БДУІР: У ПАШАНЕ «ПРАГРАМНАЯ ІНЖЫНЕРЫЯ» І «ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ»

У вядучай «электроннай» ВНУ краіны самы высокі прахадны бал у бягучым годзе быў на спецыяльнасць «Праграмная інжынерыя» факультэта камп'ютарных сістэм і сетак — 363 балы. Другое месца — «Штучны інтэлект» факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання — 347 балаў. Замыкае тройку «Праграмная інжынерыя» факультэта камп'ютарнага праектавання — 345 балаў.

На завочную скарочаную форму атрымання адукацыі на ўмовах аплаты ў бягучым годзе да залічэння рэкамендаваны больш як 500 выпускнікоў каледжаў. Па выніках прыёму дакументаў на ўсе формы навучання ў бягучым годзе было сабрана 3,8 тысячы заяў, што прыкладна на 500 чалавек больш, чым у 2024-м. Гэтым летам у БДУІР падалі свае дакументы 4 абітурыенты, якія набралі 400 балаў на экзаменах.

Сярэдні бал залічаных абітурыентаў па дзённай форме атрымання адукацыі склаў за кошт сродкаў бюджэту — 350 балаў, на ўмовах аплаты — 303 балы. З балам 300 і вышэйшым дакументы падалі 1919 чалавек.

## ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ: КОНКУРС НА «МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА» — 11,5 ЧАЛАВЕКА НА МЕСЦА

Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава прыняў у свае рады амаль 1050 першакурснікаў і выканаў план прыёму абітурыентаў на бюджэтную і платную формы атрымання адукацыі.

Агульны конкурс на ўсе спецыяльнасці бюджэтнай формы навучання склаў 2,3 чалавека на месца.



Найбольшай папулярнасцю ў абітурыентаў ВДУ імя П. М. Машэрава ў 2025 годзе карысталіся спецыяльнасці:

«Міжнароднае права» юрыдычнага факультэта дзённай формы навучання (конкурс — 11,5 чалавека на месца);

«Правазнаўства» юрыдычнага факультэта дзённай формы навучання (конкурс — 5,8 чалавека на месца);

«Дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя» мастацка-графічнага факультэта дзённай формы навучання (конкурс — 5,0 чалавека на месца);

«Псіхалогія» факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі дзённай формы навучання (конкурс — 4,4 чалавека на месца);

«Адукацыя ў галіне фізічнай культуры» факультэта фізічнай культуры і спорту завочнай форму навучання (конкурс — 2,5 чалавека на месца).

Акрамя таго, максімальны вынік 100 балаў па ЦЭ (ЦТ) маюць 7 чалавек.

Найбольш высокі прахадны бал склаўся па спецыяльнасцях: «Міжнароднае права» (370 балаў), «Правазнаўства» (342 балы), «Рамана-германская філалогія» (331 бал), «Мастацкая адукацыя» (300 балаў).

Найвышэйшы бал (388) у абітурыента, які паступіў на спецыяльнасць «Рамана-германская філалогія» факультэта гуманітарных ведаў і камунікацый.

У 192 абітурыентаў ВДУ агульная сума балаў была 300 і вышэй.

199 абітурыентаў па 18 спецыяльнасцях былі залічаны па мэтавым дагаворы.

## ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ: БОЛЬШ ЗА 200 «МЭТАВІКОЎ»

Навучацца ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы прыйдуць 2403 першакурснікі: 1442 студэнты будуць навучацца за кошт сродкаў бюджэту, 961 — на платнай аснове.

Найвышэйшы бал (391) набрала абітурыентка, якая паступіла на спецыяльнасць «Міжнароднае права», маючы 100-бальны вынік па англійскай мове. 29 % першакурснікаў — 690 — паступілі з агульнай сумай балаў 300 і вышэй. Сярод залічаных у лік студэнтаў 25 уладальнікаў 100-бальных вынікаў ЦТ і ЦЭ і два ўладальнікі адразу двух 100-бальных сертыфікатаў.

На ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ва ўніверсітэт імя Янкі Купалы залічаны 202 чалавекі.

Сярод першакурснікаў-купалаўцаў 23 выпускнікі профільных класаў педагагічнай накіраванасці і 6 выпускнікоў профільных класаў інжынернай накіраванасці, якія паступілі па сумоўі.

### ВЫ ЯШЧЭ ПАСПЯВАЕЦЕ!

Для тых, хто хоча атрымаць запатрабаваную на рынку працы прафесію за больш кароткі тэрмін, важная інфармацыя:

► На бюджэтнае навучанне ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі прыём дакументаў ужо скончаны, але на платнае заявы прымаюцца да 14 жніўня.

► Падача дакументаў на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі працягнецца да 23 жніўня.

► Пасля каледжа можна паступіць у ВНУ без ЦТ і са скарочаным тэрмінам навучання. Як відаць з напісанага вышэй, такой магчымасцю карыстаюцца многія.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Собственник имущества** | ООО «Борисовский завод двигателей «Джили», УНП 690667827, Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, дом 95, пом. 903, часть кап. строения |
| **Продавец** | Ликвидатор ООО «ДЖАСТАС», УНП 591029172, Гродненская обл., г. Гродно, пр. Купалы Янки, д. 87, оф. 614 |

**Первый повторный электронный аукцион в процессе ликвидации. Ранее опубликованное извещение о проведении электронного аукциона в газете «Звязда» № 120 (30508), стр. 8**

**Предмет электронного аукциона**

| **Лот, №** | **Наименование** | **Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %** |
|---|---|---|
| **1** | Сборочная линия на базе автоматизированного конвейера (в состав входит: спутник спуска для конвейера, стенд сборки двигателя с коробкой передач), инв. № 17130 | 41 313,24 |
| **2** | Стенд пусковых испытаний двигателя (в состав входит: горячий стенд пусковых испытаний двигателя, тележка для зоны ремонта), инв. № 17131 | 147 282,84 |
| **3** | Автоматизированный испытательный комплекс на базе стенда пусковых испытаний двигателя (в состав входит: тележка для испытания двигателя, электрическая таль), инв. № 17125 | 10 443,60 |
| **4** | Сборочная линия на базе автоматизированного конвейера (в состав входит: производственный конвейер для сборки, спутник для конвейера, роботизированная тележка для транспортировки двигателей, стенд подборки выпускного коллектора, стенд сборки коробки передач, передвижной стеллаж для выхлопного коллектора, трехуровневый стол для инструмента, компрессор), инв. № 17126 | 90 617,40 |

**Задаток 10 %** от начальной цены электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» **https://iintorgi.by**

**Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 3 (трех) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты имущества

**Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги», размещенным по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник электронного аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета электронного аукциона на 5 %, обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить оператору ЭТП вознаграждение в размере **2–3 % в зависимости от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронного аукциона**

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:** 19.08.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00, электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 07.08.2025 по 18.08.2025 г. до 17.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества, принадлежащего**

**ОАО «Бобруйский завод КПД»**

**на праве собственности**

**Аукцион состоится 28.08.2025 в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

Лот № 1. **Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 710/U-77090,** пл. – 1 423,2 кв. м, назначение: Здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000002002357 (пл. – 0,2551 га, право аренды) по адресу: г. Бобруйск, ул. Днепровской флотилии, 1А.

**Начальная цена продажи: 155 520,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 15 552,00 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 27.08.2025 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

Продавец: ОАО «Бобруйский завод КПД», УНП 700016179, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 130.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего**
**ОАО «Могилевоблавтотранс»**
(г. Могилев, ш. Гомельское, 1, тел. 8-0222-46-71-90)

**Электронные торги состоятся 09.09.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

Лот № 1: **Автобус MAZ-231062,** тип кузова – вагон, кузов (рама) № Y3M231062E0000099, р/з – АЕ 6724-6, г. в. – 2014.
**Начальная цена продажи: 91 560,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 9 156,00 бел. руб.**

Лот № 2: **Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9-1320-031,** кузов (рама) № Y3M5440A9A0000442, р/з – АА 6642-6, г. в. – 2010.
**Начальная цена продажи: 19 800,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 1 980,00 бел. руб.**

Лот № 3: **Полуприцеп бортовой тентовый MAZ 975830,** кузов (рама) № Y3M975830A0004321, р/з – А 1488 А-6, г. в. – 2010.
**Начальная цена продажи: 14 280,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 1 428,00 бел. руб.**

**Местонахождение объектов:**
**Могилёвская обл., г. Костюковичи, Промбаза, АП № 8.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в торгах: по 05.09.2025 до 12.00.

Порядок оформления участия в торгах, порядок их проведения, а также определения лица, выигравшего торги, и порядок оплаты вознаграждения содержатся в информации о проведении торгов, опубликованной на сайте Организатора торгов GOSTORG.BY. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 3 дня до даты торгов. Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней с даты торгов. Извещение также размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь и на торговой площадке GOSTORG.BY.

Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Зеленоборское»** (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

- **административно-производственный корпус** общ. пл. 1 561,3 кв. м с инв. № 602/С-22094 *(трехэтажное кирпичное здание административно-производственного корпуса с цехом № 1)*, адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Правдинский, ул. Юбилейная, 50В;
- **здание цеха № 2** общ. пл. 1 300,5 кв. м с инв. № 602/С-22095 *(здание цеха № 2, пристройка, подвальный этаж, подъездная дорога, площадка открытого склада, ограждение, наружные сети электроснабжения)*, адрес: Пуховичский р-н, г. п. Правдинский, ул. Юбилейная, 50В/1;
- **здание гаража** общ. пл. 236,2 кв. м с инв. № 602/С-22096, адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Правдинский, ул. Юбилейная, 50В/2;
- **наружные сети теплоснабжения** протяженностью 34,5 м с инв. № 602/С-245532, адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Правдинский, 229;
- **наружные сети водопровода** протяженностью 20,2 м с инв. № 602/С-245534, адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Правдинский, 231;
- **наружные сети канализации** протяженностью 132,4 м с инв. № 602/С-245533, адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Правдинский, 230;
- **многолетние насаждения (сосны, 15 ед.)** с инв. № по бух. учету 7301.

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624455500001000179 площадью 1,2734 га** *(право постоянного пользования)*, **адрес земельного участка: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Правдинский.**

**Земельный участок имеет ограничения прав в использовании:** охранная зона сетей и сооружений водоснабжения (0,4560 га и 0,0308 га), канализации (0,4560 га и 0,0308 га) и теплоснабжения (0,4560 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 168 812,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **116 881,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015,ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **09.09.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.09.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (01775) 67-9-10, 8 (044) 534-15-00.**

УНН 600017352

Печать ООО «Медикалфорт групп» (УНП 192622953) **считать недействительной в связи с утерей**.

УНП 192290290

Св-во о госрегистрации, устав и печать ООО «ЭкоЭлитСтоун» (УНП 192382335) **считать недействительными в связи с утерей**.

УНП 192290290

Утерянный договор страхования серии ПЕ 0978601 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным**.

# «ДОБРЫ СТАІЦЬ УРАДЖАЙ. ЁСЦЬ ШТО ЎБІРАЦЬ»

## Будзем і са збожжам, і з агароднінай, і з бульбай



Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый ГОРЛАЎ у праграме «Актуальнае інтэрв'ю» на тэлеканале «Першы інфармацыйны» расказаў, як праходзіць уборачная кампанія ў Беларусі і на які ўраджай агародніны можна разлічваць.

Тэмпы ўборкі дэманструюць рост дзякуючы паляпшэнню ўмоў надвор'я. Завяршаецца ўборка рапсу. Большасць камбайнаў будзе перакінута на ўборку збожжавых і зернебабовых. Механізатары і кіраўнікі гаспадарак неаднаразова казалі, што дождж на ўраджайнасць асабліва не паўплываў. Раслінам патрэбна вільгаць, і таму ўраджайнасць атрымалася вышэйшая за леташнюю.

«Дзякуючы дажджам, якія праходзілі ў чэрвені і ліпені, адбыўся наліў збожжа. За кошт той вільгаці, якая ў нас была, мы атрымліваем вялікую ўраджайнасць збожжа. Колас добры. Збожжа мае большую масу, чым у 2024 годзе», — падкрэсліў Юрый Горлаў.

Ён адзначыў, што ў краіне выйшлі на аптымальную структуру сяўбы азімых збожжавых, якія даюць большую ўраджайнасць. На іх робяць стаўку ў збожжавым кліне (займаюць, як правіла, каля 65 %).

«Асцярожна падыходзілі да апрацоўкі азімага ячменю, і сёння выйшлі ўжо на тую аптымальную структуру сяўбы, якая патрабуецца нам для таго, каб раней убраць гэту культуру і падрыхтаваць палі для сяўбы рапсу, якая ўжо надыходзіць днямі», — сказаў міністр.

Галоўнае ў жніве — убраць ураджай без страт. Асобная ўвага — палеглым участкам. «У нас іх сёлета няшмат, але, тым не менш, ёсць. І ў першую чаргу там, дзе забалочаныя месцы. Гэтую палегліцу трэба хутка ўбраць, таму што пад уздзеяннем вільгаці прарастае трава. Адпаведна, будуць цяжкасці ва ўборцы, могуць быць вялікія страты», — адзначыў Юрый Горлаў.

Адказваючы на пытанне аб ураджаі іншых культур, класічным наборы «для баршчу», Юрый Горлаў адзначыў: «Адназначна краіна будзе з агароднінай. Так, у пачатку года замаразкі нас не парадавалі, загінула частка пасеваў, але, тым не менш, расце добрая бульба на палях — недзе каля 1 млн т павінны атрымаць у сельскагаспадарчым сектары. Адпаведна, і морква, і буракі, і цыбуля — тыя культуры, росту якіх сёння надвор'е спрыяе».

Міністр дадаў, што ў аграрыяў дастаткова сродкаў, каб сабраць ураджай у тэрмін. Будуць падрыхтаваны сховішчы да закладкі агародніны на міжсезонны перыяд. Бульбы плануецца атрымаць больш за леташні ўзровень.

Ход уборкі збожжавых, зернебабовых, рапсу знаходзіцца на пастаянным кантролі. «Настрой у людзей добры. Ёсць што ўбіраць. Добры стаіць ураджай. Усе разумеем, што кожны з нас працаваў не дарма», — дадаў Юрый Горлаў.

Усе пытанні вырашаны. Сельгаспрадпрыемствы забяспечаны палівам, сёлета закупілі 567 новых збожжаўборачных камбайнаў. «І работа па закупцы энерганасычаных трактароў, усяго таго, што неабходна для нашых аграрыяў, прадаўжаецца», — дадаў Юрый Горлаў.

**Паводле БелТА.**




# ПРАДУХІЛІЦЬ ПРАСЦЕЙ, ЧЫМ ПАТУШЫЦЬ

## Высветлілі, як ратавальнікі Міншчыны ствараюць бяспеку падчас уборачнай

Нягледзячы на дажджлівае лета, уборачная кампанія — 2025 у самым разгары па ўсёй краіне. Бяспека ў гэты час знаходзіцца на асаблівым кантролі ратавальнікаў. Супрацоўнікі МНС загадзя рэалізавалі комплекс прафілактычных і арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да ўборачнай, але ж... Загаранні, на жаль, усё роўна здараюцца. Так, напрыклад, днямі ў Брагінскім раёне работнікі МНС выратавалі больш за 90 гектараў збожжавых культур. Таксама дзякуючы ратавальнікам у Стаўбцоўскім раёне нядаўна ўдалося захаваць амаль 40 гектараў пасеваў азімага жыта. Як падраздзяленні МНС сочаць за правядзеннем уборкі збожжа, што правяраюць інспектары ў палях і наколькі аграрыі ведаюць парадак дзеянняў у выпадку ўзнікнення пажару, даведалася карэспандэнт «Звязды», адправіўшыся на палі агракамбіната «Ждановічы», што на Міншчыне.



### «КАЛІ РАПТАМ ШТО — ГАТОВЫ СПРАЦАВАЦЬ АПЕРАТЫЎНА»

На месца прызначэння прыехала з самай раніцы. Дзень стаяў даволі сонечны, уборачная кампанія тут разгарнулася ў поўную сілу. Мая задача — паглядзець, чым жа займаюцца дзяжурныя супрацоўнікі МНС падчас жніва, таму па прыбыцці адразу накіравалася да спецтэхнікі, якая прызначана для барацьбы з пажарамі.

Тут пазнаёмілася з **ратавальнікам Андрэем МАКАЕДАМ.** «Рабочая змена, спадзяюся, сёння будзе спакойнай», — гаворыць ён. Аднак напагатове трэба быць пастаянна. «Працаваць мы пачынаем, калі стартуе праца ў камбайнераў, — расказвае мужчына. — Ва ўмовах пастаянна зменлівага надвор'я аб неабходнасці нясення дзяжурства ў канкрэтным месцы нам паведамляюць звечара. Але раніцай яшчэ робім папярэдні званок. Пры ўзнікненні якой-небудзь надзвычайнай сітуацыі наш абавязак — аператыўна яе ліквідаваць. «Што будзеце рабіць, калі раптам загарыцца камбайн? Колькі ў вас ёсць часу, каб выратаваць людзей і тэхніку?» — пытаюся я. «Хопіць пару хвілін. Трэба пад'ехаць да месца здарэння, аператыўна падаць рукаўную лінію, якая напоўнена вадой або пенай. Яна ў нас ужо сабраная, падключаная. На падрыхтоўку да тушэння дарма час марнаваць не прыйдзецца ў выпадку чаго».

**Аляксандр КРУК — вадзіцель пажарнага аварыйна-выратавальнага аўтамабіля.** Працуе на ўборачнай ужо 18-ты год. «Наша задача — бяспека падчас жніва. Мы не проста сядзім у машыне, як некаторыя могуць падумаць. Перад выездам правяраем наяўнасць усіх сродкаў. Па прыездзе на палі ва ўсе вочы сочым за сітуацыяй, трымаем сувязь з камбайнерамі. Калі раптам што — гатовы спрацаваць аператыўна».

### ВЕДЫ Ў АГРАРЫЯЎ ВЫДАТНЫЯ

Набліжаўся абед. Праверыць выкананне правілаў бяспекі і правесці інструктаж на поле прыехала **старшы інспектар сектара нагляду і прафілактыкі Мінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Дар'я АЎРАЙЦЭВІЧ.** «Пры правядзенні рэйдавых мерапрыемстваў на тэрыторыі палёў падчас уборачнай нам трэба пераканацца ў тым, што на камбайнах прысутнічаюць першасныя сродкі пажаратушэння, а менавіта парашковыя вогнетушыцелі, палотнішчы, рыдлёўкі. У тым ліку варта даведацца, ці засвоіў камбайнер праграму пажарна-тэхнічнага мінімуму для таго, каб пры ўзнікненні надзвычайнай сітуацыі ведаць, як дзейнічаць, як прымяняць першасныя сродкі пажаратушэння, каму дакладваць».

Таксама супрацоўнікі МНС правяраюць наяўнасць на турбінах іскрагасільнікаў. «Акрамя таго, на полі, дзе працуе тэхніка, павінна быць так званае прыкрыццё. Гэта можа быць трактар з вадой або іншыя машыны. Абавязкова правяраем наяўнасць трактара, які падчас загарання на полі зможа абараць і лакалізаваць месца, дзе здарылася надзвычайная сітуацыя», — расказвае Дар'я Уладзіміраўна.

Паводле слоў спецыяліста, МНС правярае яшчэ захоўванне і складзіраванне кармоў на тэрыторыі сельскагаспадарчых аб'ектаў.

«Што за тып вогнетушыльнага рэчыва? Колькі часу ў вас ёсць, каб патушыць загаранне? Як часта чысціцца камбайн ад саломы?» — пытаецца супрацоўнік МНС у **камбайнера агракамбіната «Ждановічы» Святаслава ЛЮБЕЗНАГА.** За плячыма ў мужчыны шматгадовы досвед працы на ўборачнай, аграрый падрыхтаваны на «выдатна». На ўсе пытанні адказаў, ведае, што айчынны гомсельмашаўскі камбайн, на якім ён працуе, аснашчаны чатырма вогнетушыцелямі. З лёгкасцю таксама расказвае, як імі скарыстацца. «Што датычыцца абдзімання жняяркі, ачысткі камбайна ад назапашанай саломы, яна ажыццяўляецца два разы на дзень у абавязковым парадку: раніцай і пасля абеду», — гаворыць Святаслаў.

У завяршэнні інструктажу інспектар МНС нацэліла работнікаў строга выконваць правілы пажарнай бяспекі падчас уборкі і нарыхтоўкі збожжавых. А калі ўсё ж нешта здарылася — аператыўна тэлефанаваць дзяжурнай брыгадзе.





### Дарэчы

У мэтах папярэджання пажараў на аб'ектах уборкі, перапрацоўкі і захоўвання ўраджаю МНС загадзя рэалізаваны комплекс арганізацыйных і прафілактычных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да ўборкі збожжавых: з пачатку ўборачнай кампаніі работнікамі МНС абследавана больш за 8 тысяч аб'ектаў, задзейнічаных ва ўборачнай кампаніі. Органамі дзяржаўнага пажарнага нагляду з удзелам прадстаўнікоў органаў унутраных спраў і іншых зацікаўленых на месцах уборкі і захоўвання ўраджаю праводзяцца сумесныя рэйдавыя мерапрыемствы.

Асаблівая ўвага работнікаў органаў дзяржаўнага пажарнага нагляду ўдзяляецца пытанням забеспячэння супрацьпажарнага рэжыму, захавання мер пажарнай бяспекі пры ажыццяўленні тэхналагічных працэсаў, ведання работнікамі сваіх абавязкаў, парадку дзеянняў у выпадку ўзнікнення пажару, стану, наяўнасці і спраўнасці тэхнічных сродкаў супрацьпажарнай абароны, першасных сродкаў пажаратушэння, стану задзейнічанай ва ўборцы тэхнікі.

У бягучым годзе на аб'ектах уборкі, перапрацоўкі і захоўвання ўраджаю ў краіне адбылося 16 пажараў, што менш на 15,8 %, чым за аналагічны перыяд мінулага года, з іх 8 — у месцах перапрацоўкі збожжавых, 1 — на сельскагаспадарчай тэхніцы, 7 — збожжавыя культуры на корані.

Пры ліквідацыі пажараў на названых аб'ектах пажарнымі аварыйна-выратавальнымі падраздзяленнямі ўсяго ў краіне выратавана: 4 будынкі, 202,5 тоны збожжа, 358 гектараў пасеваў збожжавых.

**Яна ВАЛАСАЧ. Фота МНС.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ**
**ООО «ДИАМЕДИКА»**
Организатор торгов: ИП Субботницкий И. В. (УНП 691894209), тел.: (8029) 666-91-71.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации будут проведены 18.08.2025 г. в 16.00 по адресу: Республика Беларусь, 220100, г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 70, пом. 1Н.

**Продавец: ООО «ДИАМЕДИКА» (УНП 800007950)**
**(Продавец является плательщиком НДС)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), BYN |
|---|---|---|
| 1 | 1) Изолированное помещение с инв. № 500/D-7025392 площадью 129,3 кв. м (1-й этаж), расположенное по адресу: г, Минск, ул. Максима Богдановича, д. 70, пом 1Н, наименование – помещение неустановленного назначения; 2) Изолированное помещение с инв. № 500/D-7101708 площадью 222 кв. м (1-й этаж и подвал), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 70, пом. 2Н, наименование – помещение неустановленного назначения | 591428,70 |
| 2 | Система для эндоскопического исследования ЖКТ: система pH Bravo с принадлежностями, инв. № 5602, б/у | 3980,70 |
| 3 | Доменное имя diamedica.by | 822,60 |
| 4 | Доменное имя gi-capsule.by | 822,60 |
| 5 | Система BIPAP S/T, инв. № 5599, б/у | 977,40 |
| 6 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, инв. № 5589, б/у | 6027,30 |
| 7 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, инв. № 5596, б/у | 5030,10 |
| 8 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, инв. № 5594, б/у | 1153,80 |
| 9 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, система мониторинга ManoScanTM, инв. № 5601, б/у | 8741,70 |
| 10 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, система мониторинга уровня pHDigitrapperpH-Z, инв. № 5600, б/у | 5728,50 |
| 11 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, система мониторинга уровня pHDigitrapperpH-Z, инв. № 5597, б/у | 5728,50 |
| 12 | Системы вспомогательной искусственной вентиляции легких BiPAP: система BiPAP A 40 | 16245,90 |
| 13 | Система функциональной диагностики желудочно-кишечного тракта с принадлежностями и мат. FGS-0400, Код FGS-0400 – 5 шт. | 7053,30 |
| 14 | Имплантат для герниопластики: сетка хирургическая композиционная ULTRAPRO UMS3, Код UMS3 – 18 шт. | 6367,50 |
| 15 | Катетер VersaFlex LPR ZNID12 + 8RFGS9000-16 – 2 шт. | 5726,70 |
| 16 | Система функциональной диагностики желудочно-кишечного тракта с принадлежностями и материалами расходными: система Digitrapper pH-Z выборочной комплектации: рекордер Digitrapper pH-Z | 12065,40 |
| 17 | Набор аксессуаров Bravo pH (стенд для калибровки) | 6253,20 |
| 18 | Набор насосов для системы Bravo, 220 В с аксессуарами (вакуумные пробирки и фильтры Bravo) – 2 шт. | 3724,20 |
| 19 | Пакет Accuview pH (программное обеспечение) | 1602,90 |
| 20 | Рекордер pH Bravo | 32030,10 |
| 21 | Катетеры Manoscan ESO – 2 шт. | 29794,50 |
| 22 | Система PillCam для эндоскопической визуализации желудочно-кишечного тракта с принадлежностями и расходными материалами: станция рабочая Given | 10772,10 |
| 23 | Система эндоскопическая капсульная PillCam® для исследования желудочно-кишечного тракта с принадлежностями в составе: устройство для записи данных Data Recorder Kit с аксессуарами (пояс с футляром для ношения Data Recorder, датчики Data Recorder, набор кабелей); устройство зарядное Data Recorder | 11468,70 |
| **Местонахождение имущества: г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 70, пом. 1Н** | | |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 6669171.

Дополнительные сведения об имуществе, спецификациях и порядке проведения аукциона опубликованы: https://cloud.mail.ru/public/6vHB/nUQGj3A6H.

**Для участия в торгах необходимо в срок до 15.00 16.08.2025:**

1) зарегистрироваться и подать заявление на участие в публичных торгах по выбранному лоту и соглашение о задатке по электронной почте 6669171@bk.ru либо по адресу: 220100, г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 70, пом. 1Н;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY80 UNBS 3013 0096 6200 7001 3933, в ЗАО «БСБ Банк», г. Минск, BIC – UNBSBY2X, получатель – ИП Субботницкий И. В., УНП 691894209.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 4 % от начальной цены предмета торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов, но не ранее возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 20 рабочих дней со дня проведения торгов.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.06.2025

УВЕДОМЛЕНИЕ

**10 сентября 2025 года**
**состоится повторное внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Камволь»**

**Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, художественная мастерская, 2 этаж главного корпуса.**

**Повестка дня:**

1) О внесении изменений в решение годового общего собрания акционеров ОАО «КАМВОЛЬ» от 28.03.2025 (протокол № 71) по вопросу «Распределение прибыли и убытков по итогам работы Общества за 2024 год».
2) Избрание членов наблюдательного совета Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, 211 каб., тел. 354-16-22.

Начало работы собрания – 11.00.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 08.06.2025 г.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов

**№ 2025.Г.002.00178**

по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Витебский областной комитет природных ресурсов и охраны окружающей среды, 210029, г. Витебск, ул. Правды, д. 26А, тел.: 8 (0212) 247440, 247459.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY**: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 19.08.2025 в 9.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. **Автомобиль LADA 21214-120-40,** 2012 года выпуска, регистрационный номер 1785 EI-2, тип ТС – легковой специальный (джип), кузов (рама) № XTA212140C2087163, цвет – темно-бордовый, инвентарный № 01510288, пробег – 161663 км.

Местонахождение предмета электронных торгов: г. Витебск, Старобабиновичский тракт, 11а.

**Начальная цена**: 1420,00 бел. руб. без НДС.

**Задаток:** 142,00 бел. руб.

Лот № 2. **Автомобиль VAZ 21214 0,** 2012 года выпуска, регистрационный номер 3562 KE-2, тип ТС – легковой автомобиль внедорожник хэтчбек (SUV HATCHBACK), кузов (рама) № XTA212140C2088589, цвет – синий, инвентарный № 01540053, пробег – 179772 км.

Местонахождение предмета электронных торгов: Витебская область, Толочинский район, г. Толочин, ул. Энгельса, 10а.

**Начальная цена**: 1520,00 бел. руб. без НДС.

**Задаток:** 152,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 18.08.2025.**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375297898702 (Литвинов Сергей Иванович).



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОДО «ВИТАЛЮР», УНП 100921458, г. Минск, ул. Рафиева, д. 56, 2-й этаж |

| № п/п | Код ТМЦ | Предмет электронных торгов: имущество (б/у), расположенное по адресу: Минский район, Боровлянский с/с, 60 | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 00013527 | Машина упаковочная полуавтоматическая VS 26 | **326 400,00** |
| 2 | 00015981 | Машина (оборудование) для холодной сушки и вяления рыбной продукции Smairflow 5F1 | **44 880,00** |
| 3 | 00009935 | Чиллер AK-CM-ZB76-Y-E-DI | **20 400,00** |
| 4 | 00000843 | Упаковщик VS26 в комплекте с держателем лотков | **102 000,00** |
| 5 | 00019206 | Машина вакуумная упаковочная W72 | **48 960,00** |
| 6 | 00001962 | Камера холодильная Refra | **32 640,00** |
| 7 | 00020073 | Весы «Скейл» 2 СКП (Н) 1515SUS304/5 ммс индикатором СКИ-12 (нерж) в к-те въездной пандус 1,5*0,9 нерж. ст. | **7 800,00** |
| 8 | 00010044 | Иньектор Fomaco FGM 40/160F (оборудование для засолки и маринования рыбы) | **65 280,00** |
| 9 | 00012488 | Льдогенератор G160 в комплекте с накопителем BIN200 | **19 560,00** |
| 10 | 00008240 | Аппарат высокого давления с подогревом воды Karcher HDS 8/18-4 C | **9 000,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **6-10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов (точная сумма затрат и процент вознаграждения указан на сайте организатора торгов www.ipmtorgi.by)

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **09.09.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **08.09.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |




# КНІЖКІ ДА ШКОЛЫ

## Што падрыхтавалі айчынныя выдавецтвы для вучняў і іх бацькоў?




Якія новыя падручнікі з'явяцца да пачатку вучэбнага года? Якія кнігі павінны прыцягнуць увагу настаўнікаў? На што варта звярнуць увагу бацькам, каб зацікавіць дзетак чытаннем? Адказы на гэтыя пытанні — ад беларускіх выдаўцоў.

— Нягледзячы на розныя крыніцы інфармацыі, вучэбная кніга з'яўляецца асноўнай крыніцай ведаў, — адзначыла **Людміла РАМАНОЎСКАЯ, начальнік метадычнага цэнтра дзяржаўнай установы «Акадэмія адукацыі».** — Да 2025/2026 навучальнага года для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі падрыхтавана 28 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. З іх два новыя, а іншыя — перавыдадзеныя або паўторна выпушчаныя выданні. З 1 верасня 2025 года будуць выкарыстоўвацца два новыя вучэбныя дапаможнікі — па прадмеце «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» для 3 класа і па гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі для 11 класа. Абодва выданні паспяхова прайшлі апрабацыю, перш чым атрымаць дазвол на ўкараненне ў масавую практыку. Пры падрыхтоўцы да паўторнага выпуску ў іх былі ўнесены неабходныя дапаўненні і змяненні. Удасканалена структура навучальных дапаможнікаў: змест асноўнага і дадатковага тэксту, сістэма пытанняў і заданняў. Мы працягваем работу па ўдасканаленні навігацыйнага апарату нашых вучэбных



Фота з архіва БелТА.

дапаможнікаў і прывядзенні яго да аднастайнасці. Гэта актуальна і для шрыфтавых выдзяленняў, каб вучням, іх бацькам і настаўнікам было зразумела, які матэрыял — асноўны для запамінання, а які — дадатковы.

Акрамя таго, перавыдадзены 6 вучэбных выданняў для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі і 20 вучэбных выданняў для II і III ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Для пачатковай школы падрыхтаваны «Працоўнае навучанне» (1 клас), «Руская мова» (2 клас — для ўстаноў адукацыі з беларускай мовай навучання); «Беларуская мова» (2 клас — для ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання); «Чалавек і свет» (3 клас), «Матэматыка» (2 клас), «Літаратурнае чытанне» (4 клас). Для вучняў II і III ступеняў падрыхтаваны наступныя выданні для 5 класа: «Руская мова», «Матэматыка», «Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца», «Працоўнае навучанне. Праца па абслугоўванні», «Іспанская мова» (для тых вучняў, якія асвойваюць змест вучэбнай праграмы па гэтым прадмеце на павышаным узроўні). Для 6 класа: «Беларуская мова, «Французская мова»(павышаны ўзровень). Для 7 класа: «Нямецкая мова» (павышаны ўзровень), «Іспанская мова». Для 8 класа: «Нямецкая мова», «Руская літаратура». Для 9 класа: «Беларуская мова», «Геаметрыя», «Руская мова», «Французская мова», «Біялогія», «Хімія», «Геаграфія Беларусі». Для 11 класа — вучэбны дапаможнік па кітайскай мове.

Ва ўсе навучальныя дапаможнікі для II і III ступені агульнай і сярэдняй адукацыі абавязкова ўносіцца структурны элемент, які тлумачыць, як працаваць з навучальным дапаможнікам. Гэта істотна аблягчае дзецям самастойную работу з выданнем. Дапрацавана сістэма пытанняў і заданняў, каб дзеці мелі магчымасць прымяніць атрыманыя веды і ўменні для вырашэння канкрэтных жыццёвых задач.

Пры падрыхтоўцы да перавыдання і пры распрацоўцы новых дапаможнікаў цяпер аддаецца вялікая ўвага выхаваўчаму патэнцыялу вучэбнага прадмета: праз інфармацыю аб дасягненнях Беларусі і яе культурную спадчыну. Напрыклад, ёсць задачы па матэматыцы, дзе фігуруюць назвы нашых рэк ды нават знакавых прадпрыемстваў, а пры вывучэнні хіміі можна пазнаёміцца з дасягненнямі айчыннай навукі і прадпрыемствам «Гродна Азот» і іншымі. Ёсць інфармацыя пра знаных вучоных і выдатных асоб з розных галін — у залежнасці ад профілю... І нават пра першых уладальнікаў «Знака якасці».

Традыцыйна да новага навучальнага года «Акадэмія адукацыі» сумесна з выдавецтвам «Адукацыя і выхаванне» рыхтуюць вучэбны дапаможнік «Беларусь — наша Радзіма». Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусі Аляксандра Лукашэнкі першакласніку». Яго атрымаюць дзеці ў межах Дня ведаў.

— Гэта кніга, з якой цікава будзе вучыцца, з якой зручна будзе працаваць настаўніку пачатковых класаў, — падкрэсліла **намеснік дырэктара па маркетынгу і камерцыйнай дзейнасці выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Настасся РАДЗІКЕВІЧ:** — Яна змяшчае шмат інфаграфікі і сучаснай інфармацыі, якую штогод абнаўляюць. Падручнік аздоблены прыгожымі малюнкамі і абазначэннямі. Дадатковая дапоўненая рэальнасць спрашчае працэс разумення матэрыялаў. Ёсць магчымасць нават паслухаць гімн Беларусі. Выданне будзе цікавае і бацькам.

Яшчэ адзін адметны праект выдавецтва — «Я грамадзянін Рэспублікі Беларусь». Праз праект «Зроблена ў Беларусі» звяртаюць увагу на Пяцігодку якасці, дзеля найлепшага разумення падрыхтавалі адукацыйную гульню. Сёлета шмат выданняў, прысвечаных Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне, яны карыстаюцца попытам, адзначаюць у выдавецтве.

— Цяпер гісторыя, напэўна, — адна з самых важных дысцыплін не толькі ў Беларусі, — адзначыла **Анжэла САДОЎСКАЯ, намеснік аддзела рэкламы выдавецтва «Беларусь».** — На жаль, на сёння гэтую гісторыю спрабуюць перапісаць. А тэма Вялікай Айчыннай вайны знаходзіцца ў эпіцэнтры інфармацыйнай вайны. Таму важна ўсё, што тычыцца гісторыі краіны. Наша выдавецтва ўжо на працягу многіх гадоў робіць акцэнт на тэме гісторыі для школьнікаў: на сёння выдадзена каля 100 кніг. Яны прысвечаны не толькі Вялікай Айчыннай вайне, але і Першай сусветнай. Таксама гэта кнігі наогул пра гісторыю Беларусі. Каб ведаць яе не павярхоўна, заўсёды трэба звяртацца не толькі да інфармацыі, якая змешчана ў падручніках. Любы педагог спрабуе знайсці дадатковую інфармацыю.

У выдавецтва свае прапановы для дзяцей. Але калі гаворка пра кнігі, якія трэба чытаць, што называецца, па праграме, то тут увага найперш да выдавецтва «Мастацкая літаратура». **Намеснік дырэктара Віктар ШНІП** распавёў:

— Усе кнігі выдавецтва «Мастацкая літаратура» — гэта кнігі беларускай літаратуры, — класічнай і сучаснай. У нас ёсць серыя «Бібліятэка пачатковай школы», сёлета ў ёй выйшла пяць кніжак. Гэта зборнікі, у якіх змешчаны вершы, проза сучасных аўтараў і класікаў, якія вывучаюцца ў школе. Ёсць школьная хрэстаматыя, якая складаецца ў адпаведнасці з праграмай па творах беларускіх і замежных пісьменнікаў. Серыя «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» — таксама класіка, якая будзе цікавая і дзецям, і дарослым. Хацеў бы звярнуць увагу на выданне «Як сказаць па-беларуску?» — яно адрасавана тым, хто хоча засвоіць беларускія назвы самых розных прадметаў і з'яў: сутнасць слоў можна зразумець праз творы. Выданне спатрэбіцца многім, не толькі дзецям.

Такіх кніг насамрэч шмат, бо вучыцца ніколі не позна. А кажуць жа, што бацькі школьнікаў атрымліваюць сярэднюю адукацыю другі раз...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ДУША ЗА КАЛЮЧЫМ ДРОТАМ

## 13-гадовы кампазітар напісаў музыку пра «Шталаг-352»

Дзіцячае піяніна, музычныя школы, канцэрты, міжнародныя конкурсы... Менавіта так выглядае творчы шлях 13-гадовага Івана Шапарава, юнага кампазітара, чые творы ўжо кранаюць дзясяткі сэрцаў. Хлопец прызнаецца, што песні піша тады, калі ёсць натхненне. І трагедыя «Шталага-352», лагера савецкіх ваеннапалонных каля Мінска, таксама кранула сэрца юнага Вані. Ён не толькі наведаў гэтае месца, але і стварыў моцную музычную кампазіцыю «Душа за калючым дротам», каб нагадаць пра гераізм нават у нечалавечых умовах.

Ваня толькі што скончыў 4 клас музычнай школы, і ў яго праграме ёсць прадмет «Кампазіцыя». Адной з самых запамінальных падзей для яго стаў маскоўскі фестываль «У імя жыцця», прысвечаны 80-годдзю Вялікай Перамогі. У яго рамках праходзіў і конкурс кампазітараў «Спадчыннікі перамогі», у якім удзельнічаў і Ваня са сваёй сястрой Дзіянай. Юны кампазітар заваяваў Гран-пры сярод чатырох узроставых намінацый. Але, як сам прызнаецца, апроч кубка, быў і падарунак, які парадаваў значна больш: яго ваенную песню на верш Аляксандра Твардоўскага «Калі пройдзеш шляхам калон...» выканаў зводны хор у суправаджэнні эстрадна-сімфанічнага аркестра. «У мяне дрыжалі рукі ад эмоцый!» — успамінае хлопчык.

Калі звяртацца да працэсу стварэння песні, то Ваня расказвае: «Спачатку я спрабую знайсці тэкст, на які можна нешта наспяваць. Так, напрыклад, было з вершам Аляксандра Твардоўскага. Я доўга яго шукаў, перабіраючы кнігі паэтаў-франтавікоў, пакуль аднойчы ўвечары не наспяваў радкі: «Калі пройдзеш шляхам калон...»

Увогуле зацікаўленасць хлопчыка падзеямі ваеннага ліхалецця пачала праяўляцца даволі рана: «Ужо з 8-9 гадоў я стаў збіраць вялікую колькасць кніг пра вайну. Гэта і разнастайныя энцыклапедыі, падручнікі, кнігі... Апошняе, што мяне вельмі ўразіла, — «Успаміны дзяцей вайны Масквы і Мінска: шлях подзвігу». Менавіта дзякуючы такой любові да чытання, аднойчы бацька падарыў Ваню кнігу Мікалая Гаўрылава «І абатрэ Бог усякую слязу», з якой хлопчык даведаўся пра «Шталаг-352», што знаходзіцца ў Масюкоўшчыне. Івана настолькі ўразіла гісторыя маладога хлопца, які трапіў у палон, што ён захацеў наведацца ў гэтае месца, пасля з бацькам даведаўся пра Музей подзвігу савецкіх ваеннапалонных-вязняў «Шталага-352», які знаходзіцца на тэрыторыі храма Узвіжання Крыжа Гасподняга... А там і аб праекце храма, што ставіць на мэце распавесці пра подзвіг вязняў лагера маладому пакаленню.

Назвы для сваіх кампазіцый хлопчык заўсёды прыдумляе самастойна. І на гэты раз таксама ўклаў глыбокі сэнс:



**«Мой твор расказвае пра чалавека, у якога ёсць душа, што спрабуе вызваліцца з палону. Яна шукае выйсця з такога становішча, калі вымушана цярпець катаванні, холад, голад...Толькі ўявіце: хлеба вязням давалі менш, чым у блакадным Ленінградзе, людзей вымушалі на спінах цягаць камяні да Мінска. Некаторыя папросту не вытрымлівалі і насаджваліся грудзьмі на той самы дрот пад электранапружаннем, які іх стрымліваў. І я хачу паказаць, што нават у такіх абставінах душа застаецца душой».**

Сама кампазіцыя падзелена на чатыры ўмоўныя часткі: у першай расказваецца пра мірнае жыццё, у другой — праз музыку кампазітар спрабаваў перадаць тое напружанне, якое адчуваецца, калі прыходзяць фашысты, трэцяя — пра катаванні і жахі ў «Шталагу-352», а чацвёртая частка сімвалізуе надзею на вызваленне: тут вера ў лепшае дасягае свайго піка... А гучанне звону — своеасаблівы апагей усёй кампазіцыі. «Я проста хачу, каб як мага больш дзяцей даведаліся пра тыя страшныя падзеі, зразумелі, як гэта балюча. І, магчыма, нешта для сябе вынеслі...»

**Анжаліка СЦЕФАНОВІЧ.**




Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2. УНП 200100328 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**
Адрес: г. Лида, ул. Мопровская, 4

| № лота | Наименование | Инвент. № | Начальная цена лота с НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Станок по облицов. поверхн. FRIZ RU 15/30 | 00000132 | 21517,56 |
| 2 | Станок для оклейки кромок HOMAG OPTIMAT | 00000172 | 31881,80 |
| 3 | Линия обрезки мебельных щитов HOMAG FPL | 00000175 | 44273,83 |
| 4 | Станок для искусственного старения | 00000286 | 16786,06 |
| 5 | Станок многошпиндельный CB MAGGI ENGINEERING BS 21 | 0287 | 5971,20 |
| 6 | Станок фрезерный одношпиндельный ФСШ-1А | 042065 | 1059,45 |
| 7 | Станок форматно-обрезной АЛЬТЕНДОРФ | 042425 | 8674,91 |
| 8 | Обрабат. центр С ЧПУ ROVER S 1/30K3-BIESSE | 042496 | 43597,90 |
| 9 | Станок для попереч. раскроя и оптимизации DIMTER | 042522 | 62073,29 |
| 10 | Линия сращивания по длине GRECON PROFIJOINT | 042523 | 33909,59 |
| 11 | Станок четырехстор. продольно-фрез. VARIOMAT | 042524 | 60721,43 |
| 12 | Шлиф. станок BUTFERING OPTIMAT SWO 313 R | 042525 | 30304,64 |
| 13 | Пресс для склейки щита по ширине POLZER HYDROTEC | 042526 | 30755,25 |
| 14 | Форматно-обрезной круглопил. станок ALTENDORF | 042527 | 7548,36 |
| 15 | Универ. заточной станок RS 2000 | 042535 | 8224,29 |
| 16 | Полуавтомат. токарно-копир. станок с функцией фрезеровки | 042617 | 16560,75 |
| 17 | Автомат. сверлильно-пазовальный центр | 042640 | 16110,13 |
| 18 | Автомат. кромкообл. станок мод. OLIMPIC K400E | 042641 | 10477,39 |
| 19 | Универсал. шипорезный станок | 042642 | 15659,51 |
| 20 | Универс. пазов. станок с двумя рабочими столами | 042643 | 6647,13 |
| 21 | Универс. фрезерно-свер. обрабатыв. центр с ЧПУ | 042644 | 42696,66 |
| 22 | Полуавтоматич. шипорезный станок PADE TF с двумя столами | 042665 | 15659,51 |
| 23 | Сверлильно-пазовальный станок PADE MO с двумя рабочими столами | 042666 | 6647,13 |
| 24 | Строгальный станок Weinig Unimat U17N б/у | 042696 | 17912,61 |
| 25 | Станок круглоп. DMUB 40/320 | 042714 | 7548,36 |
| 26 | Станок «Софтформинг-Оптимат» K-79/E12/53 | 00000546 | 12279,87 |
| 27 | Обрабат. центр с ЧПУ ROVER B 7.40 R FT, BIESSE | 10037 | 71536,29 |
| 28 | Станок калибровально-шлиф. мод. S219R/KRTБ/У | 10067 | 32332,42 |
| 29 | Автоматич. многопил. станок мод. SM 300-COSMEC | 10146 | 14307,65 |
| 30 | Швейная машина Brother-S-7200c-405/PFL /01410/ | 10179 | 744,02 |
| 31 | Швейная машина Brother-S-7200c-405/PFL /01411/ | 10180 | 744,02 |
| 32 | Одностор. кромкооблиц. станок для нанесения и обработки плоской кромки в рулонах (меламин, ПВХ, ABS, шпон) и в полосах массив дерева, пластик и т. п.) мод. STREAM A/5.0 – BIESSEEEDGE | 2474 | 86857,34 |
| 33 | Раскроечный центр с одной линией распила с ЧПУ SELCO SK 450 KI 3800*3200 | 3165 | 69959,12 |
| 34 | Фуговальный станок | 042158 | 1735,38 |
| 35 | Универсально-заточ. станок 3Д642Е (кл. т. П) | 042283 | 4619,34 |
| 36 | Станок заточной для ленточ. пил ZO-1/B/200 (с заточным боразоновым кругом) | 042659 | 4394,03 |

Цена снижена на 40 %.
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.07.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 19.08.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие принимаются по 18.08.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв. № 500/D-1002997, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Седых, д. 66, пом. 1. Площадь – 1422,0 кв. м. Наименование – Спортивный комплекс, расположенный на 1 и 2 этажах (пристройка к средней школе № 114). Назначение – Помещение физкультурно-оздоровительного и (или) спортивного назначения. Обременение: аренда | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 353 600,00** | **Задаток, BYN** | **135 360,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр. Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240 ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 19 августа 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 09.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **20 августа 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения | | | | | |


# 12 БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ!

# «УКЛАДЗІ 100 РУБЛЁЎ — АТРЫМАЙ 1000»

**Чалавек «праінвеставаў» неіснуючым фірмам 220 тысяч рублёў. Як не трапіцца на вуду псеўдаброкераў і не стаць іх наступнай ахвярай**

Таргетаваная рэклама даўно стала адным з найважнейшых інструментаў прасоўвання бізнесу ў інтэрнэце. Варта чалавеку, напрыклад, пацікавіцца пакупкай тэлевізара, і неўзабаве яму пачынаюць прыходзіць аб'явы з прапановамі ў Instagram або на YouTube. Але часам усё далёка не так бяскрыўдна.

## Як распазнаць кіберашуканцаў?

**Уважліва вывучыце сайт.** Часта яны выкарыстоўваюць падобныя на рэальна існуючыя, але злёгку змененыя даменныя імёны. Любое несупадзенне павінна выклікаць насцярожанасць. Абавязкова шукайце юрыдычныя даныя: адрас кампаніі, уліковы нумар падаткаплацельшчыка, кантакты. У Беларусі фінансавыя арганізацыі абавязаны іх пакідаць.

**Звярніце ўвагу, куды прапануюць перавесці грошы.** Калі рахунак знаходзіцца за мяжой ці вам раяць папоўніць крыптакашалёк, — гэта відавочная прыкмета махлярства. Нават калі ўсё выглядае пераканаўча, памятайце: замежныя пераводы і крыптавалютныя аперацыі практычна не паддаюцца адмене.

**Не давярайце захопленым водгукам у рэкламе.** Замест іх шукайце скаргі на незалежных рэсурсах. Пацярпелыя часта пакідаюць падрабязныя апісанні схемы падману. Калі іх гісторыі супадаюць з тым, што прапануюць зрабіць вам, гэта адназначна трывожны званочак.

## «ПЕРШАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ПЛАТФОРМА» — ЗУСІМ НЕ ДЗЯРЖАЎНАЯ

Апошнія гады ў інтэрнэце беларусам усё часцей трапляецца падазроная рэклама нібыта ад імя дзяржавы. Яркая назва, пераканаўчы тэкст: «першая народная праграма», «выгадны крэдыт». І нават такія прывабныя словы: «Дзякуючы нам ужо тысячы беларусаў атрымліваюць свой пасіўны прыбытак». У кадры тым часам — знакамітая асоба: вядомы тэлевядучы або чыноўнік. І вось карыстальнік ужо пераходзіць па спасылцы, нават не падазраючы, што ўсё гэта — хлусня і ашуканства.

Наглядны прыклад — рэклама «Першай дзяржаўнай платформы». Выкарыстанне ў ёй выявы афіцыйных сімвалаў Беларусі і аўтарытэту дзяржавы надае бачнасць легітымнасці. Аднак у органы ўнутраных спраў рэгулярна паступаюць звароты ад грамадзян, якія сталі ахвярамі іншых нядобрасумленных схем.

## ПА ЎСІХ ЗАКОНАХ ДЫЗАЙНУ

Часта ашуканцы хаваюцца пад вядомымі назвамі — «Беларусьнафта» або «Белнафтахім». «Навінкай» апошніх гадоў стала выкарыстанне нейрасетак для генерацыі аўдыя- і відэаматэрыялаў з вядомымі палітычнымі і грамадскімі дзеячамі. І створаныя ашуканцамі сайты выглядаюць сапраўднымі: акуратны дызайн, лагатыпы, дынамічныя графікі прыбытковасці, нібы «жывыя» водгукі. Усё, каб выклікаць адчуванне ўпэўненасці ў надзейнасці інвестыцыйнай прылады:

— Мы для сябе вылучаем цэлы кірунак — так званае «лжывае інвеставанне», — распавёў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС Аляксандр РЫНГЕВІЧ.** — Гэта калі чалавек, які ніколі раней не меў справы з інвестыцыямі, раптам трапляе на рэкламу ў інтэрнэце. У ёй прапаноўваецца ўкласці грошы нібы ў развіццё прадпрыемства або пад кіраванне нейкай структурай, якая абяцае даход. Сёння каля 10 % усіх цяжкіх злачынстваў у сферы кібербяспекі звязана менавіта з ілжывым інвеставаннем.

## «АЛЁ, ВЫ ВЫЙГРАЛІ!»

У рэчаіснасці ніякага такога механізму не існуе, а мэта ў ашуканцаў адна: завалодаць вашымі персанальнымі данымі і фінансамі. Для гэтага карыстальнікаў, паводле слоў Аляксандра Рынгевіча, заваблiваюць у «пастку». Па большай частцы — псіхалагічную:

— Пад маркай рэгістрацыі, выйгрышу прыза або атрымання кансультацыі просяць пакінуць нумар мабільнага. Пасля гэтага чалавеку тэлефануюць (часцей за ўсё праз месенджары) і пераканаўчым тонам просяць перадаць патрэбную ім інфармацыю. Напрыклад, некалькі дзён таму да нас звярнулася жанчына. Пасля пераходу па спасылцы ёй патэлефанаваў «менеджар» і дапамог стварыць асабісты кабінет. Пацярпелая перадала даныя сваёй банкаўскай карты, пасля чаго было ажыццёўлена спісанне ў 150 беларускіх рублёў.

Міністэрства ўнутраных спраў нагадвае: дзяржаўныя праграмы і інвестыцыйныя ініцыятывы не рухаюцца праз рэкламу ў інтэрнэце. «Да таго ж кожны грамадзянін павінен разумець: нават рэальна існуючая інвестыцыйная платформа не гарантуе імгненнага прыбытку ў дзясяткі і сотні працэнтаў. Калі вам абяцаюць высокі даход пры мінімальных укладах — перад вамі махлярства», — рэзюмаваў Аляксандр Рынгевіч.



## ПСІХАЛОГІЯ ДАВЕРУ

Нумары, з якіх вам тэлефануюць, могуць быць расійскімі, беларускімі, нават еўрапейскімі — геаграфія не мае значэння. Галоўнае — увайсці ў давер, у шэрагу выпадкаў — пераканаць чалавека зрабіць першы перавод. Сума можа быць невялікай, каб не спалохаць. Затым карыстальніку паказваюць яго «асабісты кабінет», дзе відаць, як нібыта расце прыбытак. І вось ён ужо гатовы інвеставаць больш, жывучы надзеяй на лёгкі заробак.

Яго, вядома ж, не будзе. Зламыснікі актыўна адгаворваюць ад вываду сродкаў, абяцаючы бонусы і скідкі за далейшыя ўкладанні:

— Калі чалавек хоча вывесці «заробленае», яму гавораць: вы страціце прывілеяваны статус, заплаціце павышаную камісію або не зможаце ўдзельнічаць у «асаблівых інвестыцыйных праектах», — растлумачыў Аляксандр Рынгевіч. — Або ахвяры прапаноўваюць не заходзіць на платформу самастойна — маўляў, у вас будзе персанальны брокер, ён будзе ўсё рабіць за вас. І вось аднойчы гэты «брокер» нібыта робіць буйную стаўку на рост долара, але курс не мяняецца — і ўсе грошы «згараюць». Чалавеку адказваюць: «Мы гатовы былі вам усё аддаць, але вы ж самі рызыкнулі — і ўсё прайгралі».

## ГРОШЫ НА ВЕЦЕР

Некаторыя людзі нават бяруць крэдыты або прадаюць маёмасць. І ўсё, каб перавесці сродкі на невядомыя, часта замежныя рахункі. Вяртанне ўкладаў у падобных сітуацыях вельмі складана, а часам і зусім немагчыма зрабіць. Асабліва ў тым выпадку, па словах намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС, калі пераводы здзяйсняліся на працягу доўгага часу:

— Менавіта таму чым раней пацярпелы звяртаецца па дапамогу, тым вышэйшая верагоднасць спыніць трансакцыю да таго, як ашуканцы паспеюць абнаявіць сродкі.

Прычым ахвяры часцей за ўсё пераводзяць грошы добраахвотна. Нядаўна такім чынам невядомы зламыснік пад маркай інвеставання на біржы завалодаў грашовымі сродкамі пацярпелай на агульную суму 6800 рублёў. Беларуска ажыццяўляла пераводы са сваёй банкаўскай карткі на працягу некалькіх месяцаў.

## ВЕДАЦЬ НЕЛЬГА ВЕРЫЦЬ

Цікавы факт: «мэтавая аўдыторыя» такіх зламыснікаў — гэта не пенсіянеры, як можа здацца на першы погляд. У асноўным, паводле звестак МУС, ахвярамі розных псеўдаінвестыцыйных праграм становяцца людзі ад 30 да 40 гадоў. Актыўныя, якія працуюць, карыстаюцца сацсеткамі і анлайн-банкінгам. Многія — з вышэйшай і нават тэхнічнай адукацыяй, дасведчаныя аб існаванні падобных ашуканскіх схем. Аляксандр Рынгевіч расказвае:

— Быў выпадак, калі чалавек сядзеў у аўдыторыі, слухаў выступленне нашых супрацоўнікаў аб такіх злачынствах, а праз два тыдні прыйшоў з заявай. На момант правядзення прафілактычнай гутаркі ён «праінвеставаў» каля 50 тысяч беларускіх рублёў. А за наступныя два тыдні перавёў яшчэ каля 170 тысяч і толькі потым усвядоміў, куды і каму.

**Аміна НАЗАРАВА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
**(организатор аукциона)**
**по поручению открытого акционерного общества «Смолевичи-Сузон» (продавец)**
**проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ КОНТОРЫ**
**с инв. № 614/С-50407 общей площадью 441,6 кв. м,**

**расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624882505601000190 (право постоянного пользования) площадью 0,0588 га, по адресу: Минская область, Смолевичский район, Курганский с/с, аг. Кленник, ул. Торговая, 16.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона пруда № 22, пл. 0,0588 га.*
Начальная цена с НДС (20 %) – **12 603,79** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 260,00** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 80 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 03.12.2022, 08.07.2023, 02.10.2024, 17.12.2024.

Аукцион состоится **21.08.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.08.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (801776) 5-61-85, (8029) 113-38-54.**

УНП 691747895

# СУД ДЫ СПРАВА

## Як «у выпадку чаго» правільна сябе абараніць?



Жаданне і ўменне адстойваць свае законныя правы — падмурак, на якім стаіць цывілізаваны свет. Веданне ўласных правоў (і абавязкаў, вядома) — важны аспект не толькі асабістай бяспекі, але і псіхалагічнага дабрабыту сучаснага чалавека. Ну, а калі гарантаваныя Канстытуцыяй правы парушаны, на дапамогу прыйдзе адвакат. Як яго выбраць, у чым ён можа дапамагчы і ў якіх выпадках — бясплатна, мы спыталі ў адваката Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алены ГРОНСКАЙ.



### АДВАКАТ — НЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІК

***— Ці ёсць у нашай краіне прыватныя адвакаты?***

— Адвакатам у Рэспубліцы Беларусь можа быць фізічная асоба, якая з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, прайшла ва ўстаноўленых гэтым законам выпадках стажыроўку і здала кваліфікацыйны экзамен, атрымала ліцэнзію на ажыццяўленне адвакацкай дзейнасці і з'яўляецца членам тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў.

**Адвакацкая дзейнасць не з'яўляецца прадпрымальніцкай. Такім чынам, ужыванне тэрміналогіі «дзяржаўны» і «прыватны» адвакат не будзе карэктным, бо заканадаўствам Рэспублікі Беларусь не прадугледжаны падзел адвакатаў на дзяржаўных і прыватных.**

***— Дайце параду: як выбраць адваката?***

— Пры выбары адваката неабходна ўлічваць вопыт работы, дзелавую рэпутацыю, спецыялізацыю і асабістыя зносіны. Не сакрэт, што менавіта рэкамендацыі ад сяброў, знаёмых, сваякоў або калег, якім раней аказвалася юрыдычная дапамога, часта з'яўляюцца вырашальным фактарам пры выбары адваката. У ходзе сустрэчы з адвакатам варта ацаніць яго прафесіяналізм і асабістыя якасці, абмеркаваць сітуацыю і задаць пытанні. Вывучэнне інфармацыі ў вольным доступе ў сетцы Інтэрнэт таксама спрыяе выбару. Звесткі аб усіх адвакатах размешчаны на афіцыйным сайце Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў і на сайтах тэрытарыяльных калегій адвакатаў.

***— Ці ёсць гарантыі, што праблемы кліента і асабістая інфармацыя не стануць «здабыткам грамадскасці»?***

— Адвакацкая таямніца — гэта звесткі аб пытаннях, па якіх кліент звярнуўся па юрыдычную дапамогу, сутнасць кансультацый, тлумачэнняў, даведак, атрыманых кліентам ад адваката, звесткі аб прыватным жыцці кліента, інфармацыя, атрыманая ад кліента, пра абставіны здзяйснення злачынства па крымінальнай справе, па якой адвакат ажыццяўляў абарону правоў, свабод і інтарэсаў кліента, а таксама звесткі, якія складаюць камерцыйную тайну кліента.

**Захаванне адвакацкай таямніцы — безумоўны прыярытэт дзейнасці адваката. Абавязак захавання адвакацкай таямніцы не абмяжоўваецца ў часе.**

### ПЛАТНА АБО БЯСПЛАТНА?

***— Дапамога адвакатаў — заўсёды платная?***

— Паводле агульнага правіла, юрыдычная дапамога аказваецца адвакатамі на платнай аснове, на падставе дагавора на аказанне юрыдычнай дапамогі. Але ў выпадках і парадку, прадугледжаных Законам «Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» і іншымі заканадаўчымі актамі, юрыдычная дапамога аказваецца за кошт сродкаў калегій адвакатаў, рэспубліканскага і (або) мясцовага бюджэтаў.

***— А як вызначаецца памер аплаты за юрыдычную дапамогу?***

— У адпаведнасці з п. 54 правілаў прафесійнай этыкі адваката, пры вызначэнні памеру ганарару прымаюцца да ўвагі наступныя фактары: вопыт і кваліфікацыя, патрэбныя для аказання юрыдычнай дапамогі; прафесійны аўтарытэт адваката; навізна і складанасць пытанняў; неабходныя выдаткі часу і працы; верагоднасць таго, што прыняцце дадзенага даручэння абмяжуе магчымасці адваката адначасова працаваць па іншых справах; тэрміны, устаноўленыя кліентам або абставінамі; неабходнасць прыцягнення спецыялістаў; выдаткі, звязаныя з аказаннем юрыдычнай дапамогі; практыка вызначэння памеру ганарару ў дадзеным рэгіёне, а таксама ў рэгіёне, у якім кліент пастаянна пражывае, і іншыя фактары.

***— У якіх выпадках грамадзяне маюць права атрымаць юрыдычную дапамогу бясплатна?***

— У адпаведнасці з артыкулам 28 Закона «Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», юрыдычная дапамога грамадзянам Рэспублікі Беларусь, замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства аказваецца за кошт сродкаў калегій адвакатаў:

- істцам — пры складанні заяў і вядзенні спраў у судах першай інстанцыі, звязаных з працоўнымі праваадносінамі, аб спагнанні аліментаў, аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў;
- удзельнікам і інвалідам Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў — пры дачы вуснай кансультацыі па пытаннях, не звязаных з прадпрымальніцкай дзейнасцю;
- грамадзянам — пры складанні заяў аб устанаўленні факта атрымання заработнай платы за канкрэтны перыяд у пэўным памеры для прызначэння пенсій, аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным;
- інвалідам I і II групы — пры дачы вуснай кансультацыі, якая не патрабуе азнаямлення з дакументамі;
- малазабяспечаным — аднаму з бацькоў у няпоўнай сям'і, які выхоўвае дзіця ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, бацькам (усынавіцелям, удачарыцелям) у шматдзетных сем'ях — пры дачы вуснай кансультацыі, якая не патрабуе азнаямлення з дакументамі;
- непаўналетнім — у іх інтарэсах; бацькам (усынавіцелям, удачарыцелям, апекунам, папячыцелям) непаўналетніх — у інтарэсах іх непаўналетніх дзяцей;
- пенсіянерам і інвалідам, якія знаходзяцца (пражываюць) ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, ажыццяўляючы стацыянарнае сацыяльнае абслугоўванне, а таксама законным прадстаўнікам грамадзян, прызнаных судом недзеяздольнымі — пры дачы кансультацыі па пытаннях, звязаных з забеспячэннем і абаронай правоў і законных інтарэсаў названых грамадзян;
- цяжарным жанчынам — пры дачы вуснай кансультацыі па пытаннях, звязаных з нараджэннем дзіцяці;
- іншым катэгорыям грамадзян — па рашэнні калегіі адвакатаў. Юрыдычная дапамога па пытаннях сацыяльнай абароны і рэабілітацыі ахвярам гандлю людзьмі, а ў выпадку недасягнення імі чатырнаццацігадовага ўзросту — іх законным прадстаўнікам, асобам, якія пацярпелі ў выніку акта тэрарызму, аказваецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Юрыдычная дапамога падазраванаму або абвінавачанаму аказваецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту ў выпадку ўдзелу адваката ў дазнанні, папярэднім следстве і судовым разглядзе па прызначэнні праз тэрытарыяльную калегію адвакатаў па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 9 сентября 2025 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Сергея Воркова, 4 микрорайон Барановичи-7, У-71 440100000003006145** | 0,0982 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, площадь застройки: 137 кв. м; фундамент: бетон, готовность: 12 %. Земельный участок расположен в охранных зонах электрических сетей (0,0041 га) | 28 551,20 (9 510,22; 19 040,98) | 388,44 | 5 700,00 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру согласно индивидуально разработанному проекту в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 и решением Гродненского городского исполнительного комитета от 03.04.2025 № 249.

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 9 сентября 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 11 августа по 3 сентября 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.

Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время

# ГОРАД КАНТРАСТАЎ,
## АБО ЧАМУ ВАРТА ДАЕХАЦЬ ДА ПІНСКА

**Трэнд «Пазнай сваю краіну» з году ў год набірае абароты — з прычын як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных, то-бок дзякуючы ў тым ліку банальнай чалавечай ляноце, «рухавіку прагрэсу». Так прасцей: сеў за руль (у крайнім выпадку — на цягнік або маршрутку) — і праз некалькі гадзін ты на месцы.**

Сёлета я вырашыла пабываць на Брэстчыне — адправіцца на «беларускі экватар». Рэгіён унікальны, на Міншчыну максімальна не падобны: хто з мінчан не быў, таму будзе цікава. Пунктам назначэння выбрала Пінск, сталіцу Палесся, куды госці з-за мяжы пакуль даязджаюць не вельмі часта, таму цэны там адэкватныя і на «пераначаваць», і на «паглядзець», і на «пачаставацца».

### СТАЛІЦА ПАЛЕССЯ

Пінск — горад вялікі. Больш за 120 тысяч насельніцтва, дзясяткі прамысловых прадпрыемстваў, універсітэт. Заязджаеш праз спальны раён — і як быццам не выязджаў з Мінска: супермаркеты, шматпавярховікі-«чалавейнікі»... Першая думка: ці варта было ехаць у такую далеч?! Але не спяшайцеся расчароўвацца, бо Пінск — горад маленькі, камерны. Цэнтр гэтага «мегаполіса» (няхай і стаіць горад крыху ў баку ад асноўных аўтатрас) стварае ўтульнае ўражанне невялікага гарадка. Як такое магчыма? Можа быць, справа ў тым, што сталіца Палесся лічыцца другім у Беларусі гарадам пасля Гродна па колькасці захаваных помнікаў архітэктуры і наогул «музеем пад адкрытым небам». А старадаўняя забудова, пагадзіцеся, неяк «цяплейшая» за сучасную архітэктуру. Але, хутчэй за ўсё, дзякуючы мясцовым жыхарам: тут (у адрозненне ад сталіцы, хоць, вядома, гэта суб'ектыўна) прынята цікавіцца людзьмі. Здавалася б, людзі прыходзяць і сыходзяць — усіх не запомніш, але толькі не ў Пінску. Тут ты госць толькі ў першы вечар. У другі — ужо крыху «свой». У фірменнай краме Брэсцкага мясакамбіната, напрыклад, не забыліся, што ўчора я пыталася пра мясцовы гатунак каўбасkі (у Мінску такой не бачыла), і на наступны дзень прапанавалі пакаштаваць: свежанькую падвезлі. У іншай — цікавяцца, ці спадабалася марожанае з перцам чылі, таксама мясцовае вынаходства. А ў буціку адзення — вы праходзіце міма, але дзверы адчыненыя, бо на вуліцы спякота — прапануюць прымераць кофтачку, таму што ўчора не было патрэбнага памеру, а сёння ёсць. І каву за дзве гадзіны да адкрыцця гатовыя зварыць, калі ўжо вам не спіцца... Рака Піна, што дала назву гораду, таксама мае свой «кантраст». Ёсць дзве версіі яе назвы — ці то ад старажытнаіндыйскага «pinas» («вялікі», «тоўсты»), ці то ад фінскага прыметніка «маленькі». Гісторыкі спрачаюцца...



Ансамбль кляштара Францысканцаў.

### ДРАЎЛЯНЫ РОВАР І ПАЛЕСКАЯ МІСТЫКА

У Пінску (як, дарэчы, і ва многіх нашых гарадах і мястэчках, што прыемна, на мой погляд) за аснову ў турыстычнай галіне бярэцца падыход, які можна апісаць модным словам «імерсіўнасць» («паглыбленне»). У Пінску ён выяўляецца асабліва ярка. Тут робіцца акцэнт на максімальную непадобнасць і своеасаблівасць. Госцю прапануецца стаць нават не даследчыкам, а, скажам так, «адным з мясцовых». Такі падыход сёння лічыцца ў сусветнай турындустрыі больш сучасным — пра гэта разважаюць і пішуць прафесіяналы турбізнесу.

Што паглядзець у Пінску? Напрыклад, езуіцкі калегіум — надзвычайна прыгожы будынак у барочным стылі. Стаіць ён тут з XVII стагоддзя і да гэтага часу выдатна выглядае. Унутры вузкія лесвіцы, выцертыя тысячамі далоняў парэнчы, вокны з элементамі рэнесансу, высокія столі, чорна-белая плітка на падлозе, як у гістарычным кіно. У будынку размешчаны Музей Палесся — велізарная экспазіцыя, унікальныя экспанаты (а ўваход усяго 5 рублёў): каменны саркафаг XII стагоддзя з ружовага сланцу, знойдзены ў 1960-х падчас раскопак у Тураве; біўні і фрагменты шкілета мамана — іх палеантолагі адшукалі непадалёк, на Брэстчыне; драўляны ровар, які ў 1933 годзе зрабіў жыхар вёскі Багданаўка Васіль Ільючык і прадаў дырэктару пінскага музея Дзмітрыю Георгіеўскаму за 10 злотых.

Таксама можна паглядзець на дом Якуба Коласа. Класік пражыў у Пінску тры гады (з 1912-га па 1915-ы), і гэтыя гады былі лёсавызначальнымі для яго. Менавіта тут малады геній сустрэў будучую жонку, і менавіта ў Пінску адбылося іх вяселле.

Яшчэ адзін турыстычны пункт — Палац Бутрымовіча (барока і класіцызм), камень у падмурак якога заклаў апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.



Бясспрэчна, варты наведвання трохнефны сабор Ушэсця Найсвяцейшай Панны Марыі — сэрца архітэктурнага комплексу манастыра францысканцаў. Пабудаваны ў XIV стагоддзі, дагэтуль мяккім перазвонам ён кожную раніцу будзіць горад. Унутры прыгажосць ані меншая, чым у шырока растыражаваных Гервятах, але своя, унікальная. Фатаграфаваць і здымаць відэа нельга, аднак калі «толькі для сябе», то вам могуць дазволіць. А па выхадных у касцёле іграе арган.

Містыка? Ды колькі заўгодна! Калі (як мне) вам нікуды з Пінска з'язджаць не хочацца, яе можна знайсці і ў цэнтры горада: калі ласка, гасцініца «Англійская». Адкрыў яе ў 1925 годзе нехта Моўша Шміт (калісьці Пінск лічыўся яшчэ і яўрэйскай сталіцай беларускай зямлі). Гасцініца была шыкоўнай. У кожным нумары ўладальнік усталяваў цуд тэхнікі — тэлефон, а першы паверх займаў найлепшы ў горадзе рэстаран і кабарэ «Парадыз». Тут збіраліся афіцэры, багатыя маладыя людзі, нярэдкія былі бойкі і дуэлі — у тым ліку з-за чароўных жаночых вачэй. Паводле легенды, адзін з аматараў прыгожага жыцця пакінуў маладую жонку дзеля прыгажуні-спявачкі, а пакінутая жанчына скончыла жыццё самагубствам. І дагэтуль яе дух блукае па калідорах «дома Шміта» (дзе забаўляўся яе здраднік-муж), стогнучы і ўздыхаючы.

### ПОМНІК ПІНЧУКУ І МЯСЦОВАЕ ХАРЧАВАННЕ

З пазнейшых «сведак гісторыі» варта паглядзець помнік Леніну — быццам бы апошні з устаноўленых у гарадах БССР. Ільіч у Пінску таксама незвычайны: не замёр у звыклай позе турыста, што галасуе на аўтатрасе, а бадзёра крочыць да светлай будучыні. Ну і, вядома, абавязкова трэба наведаць помнік пінчуку. Стаіць ён горда, а надпіс паведамляе: «Папершае, я з Пінска...». Лічыцца, што статуя выконвае жаданні: трэба толькі пацерці ёй нос. Нос у «пінчука» нацёрты да бляску. Зрэшты, можна патрымаць яго і за руку — гэта таксама, кажуць, дорыць удачу.

З грамадскім харчаваннем у Пінску ўсё ў парадку. Нават на пешаходнай вуліцы Леніна па мінскіх мерках зусім не дорага, прытым што порцыі сапраўды вялікія. Кажуць, раней морапрадуктамі карmілі на караблiку-рэстаране непадалёк ад гасцініцы «Прыпяць». Караблік на рацэ сапраўды стаіць, але рэстаран зачынены. Зрэшты, побач ёсць пельменная — не так экзатычна, затое смачна. Плюс у мясцовых рэстаранах раз-пораз праходзяць розныя акцыі. Варта было б расказаць пра пінскі кірмаш з мясцовымі разнасоламі, але пра гэта трэба пісаць асобны артыкул.

Калі ўсё вышэйпералічанае для вас не падстава пабываць у «сталіцы Палесся», ужо і не ведаю, што вам яшчэ трэба!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, земельного участка в частную собственность с расположенным на нем не завершенным строительством незаконсервированным жилым домом

**Организатор электронных торгов:** Туринский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Турин, ул. Центральная, 49Б, тел.: (801713) 98635, 43296, 8 (029) 7503249
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **9 сентября 2025 г.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес объекта, характеристики | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Шкавиловка, уч. 24 Г | 624487910101000098, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,2128 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 5 450,00 | 545,00 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2972,61 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |
| 2 | Минская область, Пуховичский р-н, аг. Турин, ул. Центральная, уч. 129 | 624487909101000303, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,2094 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 12 550,00 | 1255,00 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2594,78 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |
| 3 | Минская область, Пуховичский р-н, аг. Ситники, ул. Солнечная, уч. 6 | 624487907801000313, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1287 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 9 000,00 | 900,00 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2766,40 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **4 сентября 2025 года, до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143

# «МАЛА ДЗІЦЯ НАРАДЗІЦЬ... ТРЭБА ЯШЧЭ ВЫВЕСЦІ Ў ЛЮДЗІ»

...Апоўначы медсястра ўкаціла ў палату інвалідную каляску, дапамагла хворай злезці, уладкавацца на бальнічным ложку і зачыніла за сабой дзверы. Суседкі па палаце (усё роўна ж прачнуліся) сталі назіраць за новенькай ды знаёміцца. «Тата, — ціха прашаптала тая і раптам дадала: — Я хачу есці... Можа, у вас ёсць што-небудзь?»

Пятроўна, якую ўсе тут звалі цёткай Зінай, адразу падала жанчыне дзве булачкі, у кубак наліла соку. Баба Наста з тумбачкі дастала яблыкі. Тата, пад'еўшы, пачала аповед пра сябе.

Замуж яна выскачыла ў васямнаццаць гадоў па першым вялікім, сапраўдным каханні, якое... скончылася з нараджэннем дзіцяці. Маладая матуля ўвесь час старалася аддаваць маленькаму, а вось бацьку больш хацелася паспаць, пагуляць у камп'ютарныя гульні ды «патусіць» з сябрамі — спачатку па вечарах, потым па начах, а неяк ён не прыйшоў дадому зусім. Жонка захвалявалася, патэлефанавала яго бацьку, і той паведаміў, што сын у бальніцы з так званым перадозам.

У той жа вечар Тата забрала дзіця, вярнулася туды, адкуль прыйшла: да сваіх бацькоў, якія з радасцю прынялі іх, а найперш — маленькага ўнука.

І ўсё б нічога, яны добра жылі... Калі б праз год Тата не пахавала бацьку. Яго раптоўная смерць стала сапраўдным шокам і для дачок, і для іх матулі, якіх у горы падбадзёрваў ды падтрымліваў хіба маленькі Саша. Новая «радня» — муж-наркаман і чыноўны багаты свёкар — не дапамагала нічым.

Тата падала заяву на развод, з той вялікай крыўды і гонару адмовілася ад аліментаў. Магла сабе дазволіць, спраўлялася: у яе была дапамога з боку дзяржавы, былі сястра і мама, якая нядрэнна зарабляла... Праўда, зноў жа, нядоўга: унука завяла ў першы клас і... «Тромб», — сказалі ўрачы.

Дочкі тады счарнелі ад гора. Тата кожную свабодную гадзіну старалася злётаць на могілкі, каб праведаць сваіх, каб паплакаць, і потым ледзь прыпаўзці дамоў — ёй вельмі балелі ногі.

Неяк, не на жарт спужаўшыся, яна пайшла такі па ўрачах і ўрэшце, пасля абследавання, пачула: у яе рассеяны склероз. Страшны дыягназ... Дактары, праўда, казалі, што калі дакладна выконваць усе рэкамендацыі і двойчы на год класціся ў стацыянар на крапельніцы, то можна жыць доўга і амаль паўнацэнным жыццём...

Тата вось так і хацела: яна адмовілася ад групы інваліднасці, працавала дзеля таго, каб сын ні ў чым не адчуваў сябе абдзеленым.

...Якраз тады ў іх сталоўцы (Тата з раздачы ўбачыла) з'явіўся досыць прывабны малады чалавек, з цікавасцю паглядзеў на паварыху, а вечарам ужо чакаў яе — з кветкамі — каля службовага ўвахода.

Так, можна сказаць, рамантычна пачаўся ў Таты новы раман.

Яна не скрывала ад хлопца ні свой дыягназ, ні тое, што не будзе больш нараджаць дзяцей. Грыша казаў, што як роднага прыме Сашу, кляўся-бажыўся, што хоча клапаціцца пра іх усё жыццё. Праз год пасля знаёмства Тата здалася: маладыя згулялі вяселле, пасяліліся ў кватэры Грышавых бацькоў. Тыя, каб не жыць з нялюбай нявесткай (хворай... з дзіцем...), з'ехалі ў вёску.



Першыя два-тры гады Тата з мужам і Сашам яшчэ ездзілі да іх. Аднак відавочная непрыязь з боку свекрыві адбівала ўсякае жаданне і наведвацца, і дапамагаць — адбірала здароўе. Тата мусіла афарміць інваліднасць. Пасля чаго муж, які так шчыра абяцаў да скону клапаціцца, перастаў купляць хоць што-небудзь з лекаў і прадуктаў (не кажучы ўжо пра іншае), падаў заяву на развод, адсяліў іх з Сашам у асобны пакой.

Сысці адтуль не было куды. У бацькоўскай спадчыннай кватэры жыла сястра. На выкуп сваёй палавіны ні грошай, ні здароўя ў Таты не было, і яна працягвала жыць побач са сваім былым і (яшчэ мякка кажучы) нядобрым мужам. У той вечар, калі жанчына паступіла ў бальніцу, ён (як ні прасіла!) выклікаў «хуткую» толькі пасля таго, як Тата страціла прытомнасць...

Суседкі па палаце слухалі новенькую са слязамі на вачах, казалі: «Бач, які... Пакуль было ў цябе хоць трохі здароўя, было і каханне, быў чалавек. А потым што — «здзьмуўся»? Не мужчына ён, не...»

«Але ж і ты, дзеўка, паспяшалася, — прызнала цётка Зіна. — Навошта было ў 18 замуж бегчы? Ды яшчэ і «ў цёмную»... Трэба было пачакаць, прыгледзецца да чалавека. Ён жа, мусіць, рана паспытаў наркотыкі?.. І чаму б з яго аліменты не браць? Гонар не дазволіў? Думала, што бацькі твае вечныя? Аж не: бачыш — ні таты, ні мамы, ні Грышы... Другі твой муж не лепшы за першага. Ды і сама ты, падобна, забылася, што мала дзіця нарадзіць — трэба яго ў людзі вывесці. А ты і рукі апусціла: не змагаешся ні за сябе, ні за сына — не ідзеш у суд. Твайму Сашу колькі? Пятнаццаць? Ён вучыцца ў каледжы? Дык закон жа на вашым баку! Пішы заяву на аліменты, разменьвайце з сястрой кватэру».

...У наступны раз Тата з цёткай Зінай сышліся праз чатыры месяцы — у паліклініцы, у чарзе да неўрапатолага. Маладзіца выглядала і адчувала сябе куды лепш. Расказала, што атрымлівае нядрэнныя аліменты. Да таго ж, прадаўшы бацькоўскую кватэру, яны з сястрой купілі дзве, і ў іх з сынам цяпер ёсць жылплошча.

Але галоўнае, што хлопец вельмі слаўны расце: і вучыцца на павышаную стыпендыю, і падпрацоўвае.

— Дзякуй вам за парады, — абняўшы Пятроўну, сказала Тата. — І за штуршок... Ён надаў мне столькі сіл... Бачыце, я толькі з палачкай...

Побач тым часам адчыніліся дзверы патрэбнага кабінета: цётцы Зіне мілавідная медсястра вынесла рэцэпт на лекі, а Тату запрасіла да доктара.

**Валянціна Бабко-Аляшкевіч.**
*Салігорскі раён.*

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Хойникское РайПО** (продавец) извещает о проведении **20 августа 2025 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 343/С-96031, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Комфорт» общей площадью 192,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017994 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Тургенева, 2А. Заключен договор аренды № 39 от 10.07.2019 г. Капитальное строение с инв. № 343/С-96371, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 42 (составные части и принадлежности – подвал) общей площадью 765,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325400000010000436 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, Судковский с/с, аг. Судково, ул. Карася В.Г., 7А

Лот включает оборудование в количестве 12 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 143 808,00 бел. руб.
**Задаток** – 1 438,08 бел. руб.

**Лот № 3.** Капитальное строение с инв. № 343/С-96351, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 30 (составные части и принадлежности: две холодные пристройки, сарай, уборная, покрытие) общей площадью 81,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001018013 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Советская, 172. Капитальное строение с инв. № 343/С-96350 площадью 334,1 кв. м (здание магазина № 35, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: склад, три ограждения, покрытие, клумба), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001018014 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Советская, 127

Лот включает оборудование в количестве 8 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 167 916,00 бел. руб.
**Задаток** – 1 679,16 бел. руб.

**Лот № 4.** Капитальное строение с инв. № 343/С-96349, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 15, (составные части и принадлежности: сарай, уборная, ворота, ограждение) общей площадью 140,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001018022 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Пролетарская, 52. Заключен договор аренды № 10 от 18.11.2020 г.

**Начальная цена** продажи с НДС – 77 280,00 бел. руб.
**Задаток** – 772,80 бел. руб.

**Лот № 5.** Капитальное строение с инв. № 343/С-54884, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Удобный» (составные части и принадлежности: склад, двое ворот, ограждение) общей площадью 113,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001016346 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Карла Маркса, 45. Заключен договор аренды № 2 от 08.01.2019 г. Капитальное строение с инв. № 343/С-96373, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 21 (составные части и принадлежности – пристройка холодная) общей площадью 304,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325484812601000052 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, Стреличевский с/с, аг. Стреличево, ул. Советская, 62. Заключен договор аренды

Лот включает оборудование в количестве 11 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 99 120,00 бел. руб. **Задаток** – 991,20 бел. руб.

**Лот № 6.** Капитальное строение с инв. № 343/С-96370, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция, общей площадью 40,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001018171 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Советская, 79А

Лот включает оборудование в количестве 91 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 39 648,00 бел. руб. **Задаток** – 396,48 бел. руб.

**Лот № 7.** Капитальное строение с инв. № 343/С-45165 площадью 255,0 кв. м (здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: два навеса), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017995 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Жукова, 3Е. Капитальное строение с инв. № 343/С-96074 площадью 42,4 кв. м (трансформаторная подстанция, назначение – сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: трансформаторная подстанция), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017997 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Жукова, 3Г. Капитальное строение с инв. № 343/С-45164 площадью 23,2 кв. м (здание дизельной электростанции, назначение – здание специализированное энергетики), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017996 по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Жукова, 3Д

Лот включает оборудование в количестве 290 ед., площадка для трансформатора 2 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 349 574,40 бел. руб. **Задаток** – 3 495,74 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

**Продавец: Хойникское РайПО**, г. Хойники, ул. Жукова, 3. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 29 690-00-10.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 19.08.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

Предыдущая публикация 28.06.2025 г. в газете «Звязда»

# СЕНАКОСНА-СУНІЧНЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

**Па гарызанталі:** **4.** Каса любіць брусок, і сала ... (прык.). **6.** ... з касой па лугах мінуў, а ліпень з сярпом пабег (прык.). **7.** Невялікі драпежны звярок. **9.** Чэрвеньская ... вераб'інага носа карацей (прык.). **10.** «Чырвоная ... на купінцы спее, // Адзін мяне пацалуе, // А чатыры млее». Прыпеўка. 13. Рад, шарэнга. **14.** «І ... сцелаю суніцай // У стоме хіліцца за бор». З верша А. Мінкіна «Чэрвень». **15.** Пасудзіна для чэрпання вадкасці. **16.** Раніцай чутны ... — к вечару чакай дождж (прыкм.). **19.** Пласцінкі на канцах пальцаў чалавека. **20.** Калі суніца чырванее, не сей ... — не паспее (прык.). **24.** Сорт летняй яблыні. **26.** Тое ж, што і біяполе. **27.** Прэснаводная рыба. **28.** Кожны, хто дарос, — паспяшай на ... (прык.). **29.** Чырвонае лета — зялёны ... (прык.). **30.** Раніцай ... пахне мацней звычайнага — да дажджу (прыкм.).

**Па вертыкалі:** **1.** Плямкі на скуры; іх выводзіць сунічны сок. **2.** Верхні слой скуркі пладоў цытрусавых. **3.** Папярэдняя аб'ява. **5.** Цэлы дзень касіў ..., а за вечар каза з'ела (прык.). **8.** Калектыўная дапамога пры выкананні сельскагаспадарчых работ. **11.** «У лес чарніцы — ... // Нарэшце мы збіраць пайшлі». З верша Д. Пятровіча «Чарніцы». **12.** Рабро ў сцяне для павышэння яе ўстойлівасці. **17.** Родная зямля — ..., чужая — чарніца (прык.). **18.** Палявая кветачка. **21.** Машына для сарціроўкі і ачысткі насення. **22.** Мужчынскае імя. **23.** «Хацелася туды праспешыць ..., // Дзе на прыпёку першыя суніцы // Пакаазваюць ружовыя бачок». З верша С. Законнікава «Суніцы». **25.** Мужыку ..., што святому рай (прык.).



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** **4.** Кусок. **6.** Чэрвень. **7.** Янот. **9.** Ноч. **10.** Жураўлiнка. **13.** Шэраг. **14.** Сонца. **15.** Коўш. **16.** Гром. **19.** Ногці. **20.** Проса. **24.** Баравінка. **26.** Аўра. **27.** Лешч. **28.** Сенакос. **29.** Пакос. **30.** Трава.

**Па вертыкалі:** **1.** Васнушкі. **2.** Цэдра. **3.** Анонс. **5.** Сена. **8.** Талака. **11.** Чараўніцы. **12.** Контрфорс. **17.** Суніца. **18.** Красачка. 21. Трыер. **22.** Антон. **23.** Крок. **25.** Лета.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*






Фота Лізаветы ГОЛАД.

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 220

Сваю новую задачу прапануе наш аўтар Міхаіл Кошаль з Мінска (гл. дыяграму).



**Белыя**: Kpd6, Фd3, Cb4 (3).
**Чорныя**: Kpe8, Ch5, пg7 (3).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Працягнем аповед пра выступленне беларускіх шахматных кампазітараў на турніры гарадоў-герояў «Перамога-80».

Задача Віктара Волчака, Міхаіла Храмцэвіча, Аляксандра Варыцкага і Вадзіма Жылко падзяліла ў шматхадовым раздзеле 1-е і 2-е месцы.

**Белыя**: Kpa1, Фg2, Лc8, Ca4, Ch2, Ka8, Kf5, пп. a3, b6, d2, d4, e2 (12).
**Чорныя**: Kpc4, Фa7, Лh6, Cc6, Kg5, пп. a5, d3, d7, e3 (9).
Мат за 4 хады.

Спачатку ёсць ілюзорная гульня: 1...Лe6 2. Фd5+ Kp:d5 3. ed! ~ 4. Cb3x, 3...C:a4 4. Лc5x, 3...Ф:b6 4. K:b6x, 3...Фa6 4. Kc7x Рашае 1. Kpb2! ~ 2. ed+ Kp:d3 3. Cb5+ C:b5 4. Лc3x; 1...Фa6 2. Cb3+ Kpb5 3. Фd5+ C:d5 4. Лc5x; 1...Kf3 2. K:e3+ Kp:d4 3. Фg4+ Ce4 4. Лc4x, 3...Kpc5 4. Фc4x; 1...de 2. Cb5+ Kp:b5 3. Ф:e2+ Kpa4 4. Фc4x.

Задача Вячаслава Красічонка і Віктара Волчака заняла 10-е месца.

**Белыя**: Kpc2, Фc7, Лc3, Cb3, Cc1, Kf8, Kh7, пп. d3, e4 (9).
**Чорныя**: Kpd4, Лb8, Ca3, Cc8, Kb7, Kg6, пп. a7, b5, c6, d7, g7 (11).
Мат за 4 хады.

Ілюзорная гульня: 1...Kh4 2. Ke6+ de 3. Ф:g7+ e5 4. Фg1x Рашае 1. Cd2! ~ 2. Фg3! Cc1 3. C:c1! ~ 4. Ce3x, 3...Kf4 4. Фg7x; 1...Cc1 2. K:g6! C:d2 3. Kp:d2! ~ 4. Фe5x, 3...d6 4. Фg7x, 3...Kd6 4. Ф:d6x; 1...Ke5 2.Ke6+ de 3. Фg7! ~ 4. Фg1x; 1...Kd6 2. Ф:a7+ c5 3. Л:c5! ~ 4. Лd5x, 3...C:c5 4. Фa1x; 2...Лb6 3. Ф:b6+ Cc5 4. Ф:c5x, 3...c5 4. Ф:d6x, 3...Kpe5 4. K:g6x [1...Bd6 2. K:g6! ~ 3. Kh4!/ Sg5!, 2...C:c7 3. Kg5! ~ 4. Kf3x].

Падвердзены вынікі IX індывідуальнага чэмпіяната свету па шахматнай кампазіцыі за 2022—2024 гады. Як выступілі на ім беларускія складальнікі?

У раздзеле двухходовак Міхаіл Храмцэвіч заняў 14-е месца з 53. У трохходоўках (44 удзельнікі) Віктар Волчак на 10-м месцы, Аляксандр Варыцкі — на 27-м. У шматходоўках (52 удзельнікі) А. Варыцкі і В. Волчак занялі адпаведна 16-е і 17-е месцы. У раздзеле кааператыўных матаў (95 удзельнікаў): 24. А. Варыцкі; 36. М. Храмцэвіч; 90. Валерый Ліскавец. У задачах на зваротны мат (48 складальнікаў) М. Храмцэвічу крыху не хапіла балаў, каб заваяваць бронзавы медаль. У выніку наш суайчыннік чацвёрты. На 19-м месцы тут В. Волчак. У раздзеле казачных задач (89 удзельнікаў): 16. М. Храмцэвіч; 17. Аляксандр Булаўка.

* * *

На дзіцячым Кубку свету ў Батумі выступалі 12 юных беларускіх шахматыстаў. Дамір Булгак фінішаваў трэці сярод хлопчыкаў да 12 гадоў. А 8-гадовая Міраслава Шаціла была найлепшай у рашэнні задач.

Прызавую тройку Мемарыяла трэнера Анатоля Аліпава ў Мінску (40 удзельнікаў) склалі Пётр Казлоў, Яўген Дубіна і Герман Шрубок. У бліцы (59 гульцоў) прызёрамі сталі Аляксей Краміч, Ілья Сідарэнка і Андрэй Малюш.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. K:e4! (не вядзе да мэты 1. de? Фc5! або 1. C:e4? Фe6!) Правільна адказалі Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Сяргей Сувееў, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО**.

7 ЖНІЎНЯ | Даты | Падзеі | Людзі




**1910** год — нарадзіўся Генадзь Іванавіч Цітовіч (в. Новы Пагост Мёрскага р-на Віцебскай вобл.), беларускі этнамузыказнаўца, дзеяч харавога мастацтва, дырыжор, народны артыст Беларусі (1955), народны артыст СССР (1968). У 1939 г. арганізаваў і ўзначаліў аматарскі Падлескі народны хор у Ляхавіцкім раёне. З 1952 г. арганізатар і мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору (з 1988 г. носіць яго імя). Збіраў і вывучаў беларускі музычны фальклор. У розных раёнах Беларусі запісаў каля 3 000 народных песень і танцаў. У навуковых працах даследаваў музычную творчасць славянскіх народаў, беларускае народнае шматгалоссе, народнае выканальніцтва, стылі сучаснай народнай песні. Аўтар песень на ўласныя словы і вершы беларускіх пісьменнікаў, больш за 60 апрацовак беларускіх народных мелодый. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1978), прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1968).

**1935** год — нарадзіўся Міхаіл Мікалаевіч Шыманскі (в. Пешкі Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1985), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2002), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2009), лаўрэат Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара» (2011). Працаваў у газеце «Звязда». Аўтар кніг нарысаў і публіцыстыкі.

**Звяздоўцы далучаюцца да шматлікіх віншаванняў, якія юбіляр атрымае ў гэтыя дні.**




**1803** год — з порта Кранштат выйшлі шлюпы «Надзея» і «Нява» пад камандаваннем І. Ф. Крузенштэрна і Ю. Ф. Лісянскага — пачалося першае рускае кругасветнае плаванне, якое адкрыла цэлую эпоху рускіх кругасветных экспедыцый.

**1941** год — ваенны лётчык Віктар Талаліхін першым за Вялікую Айчынную вайну здзейсніў таран у начным паветраным баі, збіўшы на подступах да Масквы варожы бамбардзіроўшчык.

**1944** год — у ЗША запушчаны «Марк I» — першы камп'ютар, які праграміраваўся. У ім налічвалася каля 765 тысяч дэталяў (у асноўным электрамеханічных рэле і пераключальнікаў), а сама машына была больш за 2,5 метра ў вышыню і 17 метраў у даўжыню. Яе вага складала каля 4,5 тоны.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.


прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.


www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспт. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 11 456 Індэкс 63850. Зак. № 1771.
Нумар падпісаны ў 19.30 6 жніўня 2025 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12